ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛІСТАПАДА 2016 г. ЧАЦВЕР № 213 (28323)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

У ДЭКАРАЦЫЯХ ЛІСТАПАДА

Гурт Aillion: «Мы не «дыназаўры»

Кветкі ад Гошы

«За лішнюю вагу не выганяем»

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі:

«У нас на сёння, калі лічыць і грамадскія аб'яднанні, і іх арганізацыйныя структуры, афіцыйна зарэгістраваныя, больш за 40 тысяч грамадскіх фарміраванняў. Гэта сведчыць аб тым, што грамадзянская супольнасць актыўна развіваецца, пастаянна паступаюць дакументы на рэгістрацыю, на пастаноўку на ўлік арганізацыйных структур у рэгіёнах. І колькасць грамадскіх арганізацый павялічваецца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.11.2016 г.

Долар ЗША	1,9042 ▲
Еўра	2,1078 ▲
Рас. руб.	0,0300 ▼
Укр. грыўня	0,0745 ▲

ISSN 1990 - 763X

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Першы ранні снег прынёс дарослым дадатковыя клопаты, а малечы – радасць. Напрыклад, гэтыя малыя жыхары сталічнага Зялёнага Луга зляпілі ўчора сярод жоўтага лісця снежную бабу. І нават не адну.

ТУТ СОНЦА ЎЗЫХОДЗІЦЬ НА ХВІЛЮ РАНЕЙ

Паўднёвы Усход
Сумесны праект газеты «Звязда» і Магілёўскага аблвыканкама

Карэспандэнт «Звязды» накіравалася ў самы ўсходні горад краіны

Летась у Магілёўскай вобласці была зацверджана праграма, якая павінна даць дадатковы імпульс развіццю эканамічнага патэнцыялу сямі паўднёва-ўсходніх раёнаў вобласці. Указам №235 для гэтага прадугледжаны сур'ёзныя льготы і прэферэнцыі, якія прывабныя для бізнесу і цікавыя для насельніцтва. Праграма будзе спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў, будаўніцтву жылля, адным словам — росквіту. У рамках праекта «Паўднёвы Усход» «Звязда» працягвае расказваць, чым сёння жывуць гэтыя раёны і наколькі яны могуць быць цікавымі для патэнцыйных інвестараў. Мы пабывалі ў Чэрыкаўскім, Слаўгарадскім, Краснапольскім і Клімавіцкім раёнах. Цяпер рушым у Хоцімск, ці, як яго называюць тутэйшыя жыхары за аддаленасць ад абласнога цэнтра, — Далёкі Усход. А вось да мяжы з Расіяй адсюль, наадварот, няма і дзесяці кіламетраў.

СТАР. 4

Дом, які будуецца згодна з Указам №235, хутка прыме навасёлаў.

■ Грамадства

БЭБІ-БОКСЫ-БУМ

Чаму немаўляты падвяргаюцца патэнцыйнай небяспецы?

«Нованароджанага знайшлі ў кантэйнеры з адходамі! Маці выкінула дзіця на сметнік!» — кожны падобны выпадак выклікае шырокі рэзананс у грамадстве. За апошнія некалькі месяцаў аб праблеме пачалі гаварыць яшчэ часцей: у канцы жніўня на дачным участку ў Пінскім раёне знайшлі закапанае цела немаўляці, а ў верасні жыхарка Мачулішчаў выкінула дзіця, якому было некалькі хвілін з роду, у смеццеправод. Адгукнуўшыся на хваляванні ў грамадстве, новы састаў парламента нават прапанаваў разгледзець ініцыятыву з бэбі-боксамі. Мы разабраліся, што гэта такое, якія маштабы праблемы і з якімі сацыяльнымі «дэманамі» трэба змагацца ў першую чаргу.

ЛЮТАСЦЬ ЦІ ХВАРОБА?

— Па афіцыйных звестках, за апошнія пяць гадоў было зарэгістравана 21 забойства нованароджанага, што складае каля 1% ад агульнага ліку забойстваў, — адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення крымінальнай міліцыі МУС Віктар ЮЗЭФОВІЧ**. — З іх адно было здзейснена па неасцярожнасці: жанчына вырашыла, што дзіця нарадзілася нежывым, таму пазбавілася ад яго. Усе астатнія ў суадносінах 50:50 дзеляцца на два тыпы: наўмыснае забойства і дзеянні пад уплывам псіхатраўмуючай сітуацыі. У першым выпадку, у залежнасці ад абставін, злачынства можа пацягнуць за сабой ад 8 гадоў аж да вышэйшай меры — для жанчын гэта 25 гадоў пазбаўлення волі. У другім — да пяці гадоў пазбаўлення волі. Аднак да крайніх мер яшчэ не даходзіла, часцей за ўсё пакаранні адносна мяккія.

Калі разглядаць апошняе пяцігоддзе, то ні адна з 20 «недамаці», што дзіўна, не прыцягвалася раней да крымінальнай адказнасці. За імі было заўважана ўсяго два адміністрацыйныя правапарушэнні: за пражыванне без рэгістрацыі і пакінутую без нагляду распаленую печ. Гэта не асацыяльныя асобы, а нібыта зусім звычайныя жанчыны: студэнтка, прадаўшчыца і нават выхавацелька. Ды і ўзрост свядомы, непаўналетніх сярод іх няма: жанчынам ад 18 да 28 гадоў.

СТАР. 3

КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ МНОГАЕ

Учора ў Талачыне прайшлі рэспубліканскі семінар-нарада па актуальных пытаннях развіцця сацыяльнай сферы і выязное пасяджэнне камісіі па справах непаўналетніх пры Савеце Міністраў, паведамляе БЕЛТА. У абодвух мерапрыемствах прымала ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА.

«Кадры — гэта ключавое звяно ў рабоце любой галіны. Што датычыцца сацыяльнай сферы — тут патрэбны асаблівыя падыходы. Адукацыя, ахова здароўя, сацыяльная абарона — гэта работа з усімі слаямі насельніцтва, пачынаючы ад дзяцей і завяршаючы пенсіянерамі. Калі супадае жаданне чалавека рэалізавацца ў канкрэтнай прафесіі і ўменне працаваць з людзьмі — тады атрымліваецца добры вынік. У адваротным выпадку поспеху не будзе. Наша задача — выбудаваць кадравую сістэму ў сацыяльнай сферы так, каб тыя маладыя людзі, якія выбралі для сябе шлях урача або педагога, ішлі сюды па клічу душы. Немалаважна і тое, каб іх жаданне гарманічна спалучалася з характарам і чалавечымі якасцямі. Цяпер мы робім акцэнт на паступленні ў педагагічныя ВНУ, таму што без добрага педагога не будзе ні добрага ўрача, ні добрага слесара», — сказала віцэ-прэм'ер па выніках семінара-нарады.

Што датычыцца аховы здароўя, Наталля Качанава адзначыла: «Стараемся ўмацаваць пярвічнае звяно кадрамі, паляпшаем матэрыяльную базу. Але ёсць выпадкі, калі існуе неабходнасць абследаваць пацыента менавіта ў рэспубліканскім цэнтры. Гэта сістэма працуе эфектыўна».

Віцэ-прэм'ер таксама адзначыла, што ўсім установам сацыяльнай сферы трэба больш актыўна займацца пазабюджэтнай дзейнасцю. Гэты рэзерв дапамагае вырашаць пытанні наконт рамонту і ўмацавання матэрыяльнай базы і павышаць заработную плату. «Разлічваць толькі на бюджэтныя сродкі няправільна», — падкрэсліла Наталля Качанава.

■ Ад вінта!

ПЕРСПЕКТЫВА — ТОЛЬКІ ЎВЕРХ

Прадпрыемствы сферы грамадзянскай авіяцыі ўжо перавыканалі запланаваныя на год паказчыкі.

Пра гэта паведаміў **дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Уладзімір КОСЦІН**. Паводле яго слоў, за азначаны час беларускія авіятары перавезлі 1 мільён 916 тысяч чалавек (гэта на 15,4 працэнта больш, чым у 2015-м), у аэрапортах краіны абслужылі 2 мільёны 680 тысяч пасажыраў (плюс 19,3 працэнта да 2015-га), аб'ёмы перавозкі грузаў і пошты дасягнулі ўзроўню 32,5 тысячы тон (на 54,9 працэнта больш, чым летась). Асобна спецыяліст адзначыў рост, які паказвае кампанія «Белавія»: калі ў 2011 годзе перавозчык упершыню ў сваёй гісторыі «выдаў» паказчык у 1 мільён пасажыраў за год, то ўжо летась лічба дасягнула 2 мільёнаў і працягвае расці. Нядаўна былі набыты два новыя Boeing 737-800, у хуткім часе прыбудзе яшчэ адзін такі самалёт.

Генеральны дырэктар авіякампаніі «Белавія» Анатоль ГУСАРАЎ запэўніў, што перавозчык працягне працаваць над зніжэннем цэн на свае паслугі.

— Гэты трэнд для нас стаў характэрным, — адзначыў ён. — На новым рэйсе ў падмаскоўны аэрапорт «Жукоўскі» мы адпрацоўваем лаўкоставую мадэль палётаў. Як паказваюць першыя вынікі, для нас гэта рэальна, таму праект будзе пашырацца. Працягваем работу над пашырэннем сеткі маршрутаў — толькі сёлета, акрамя згаданага, з'явіліся новыя рэйсы ў Палангу, Львоў і іншыя гарады. Усе яны паказалі сябе з найлепшага боку, таму налета плануем павялічыць колькасць палётаў па гэтых напрамках, а таксама дадаць да іх новыя, напрыклад, магчыма аднаўленне палётаў у Ерэван. Днямі правядзём акцыю, прымеркаваную да нашага прафесійнага свята: праз сайт будзем прапаноўваць квіткі па ўсіх напрамках па цане ў 50 працэнтаў ад мінімальных тарыфаў. Так, напрыклад, злятаць у «Жукоўскі» і вярнуцца назад можна будзе за 35 еўра.

Што датычыцца Нацыянальнага аэрапорта «Мінск», то галоўнай задачай яго кіраўніцтва, адзначыў **генеральны дырэктар аэрапорта Дзмітрый МЕЛІКЯН,** бачыць завяршэнне будаўніцтва новай узлётна-пасадачнай паласы. З увядзеннем яе ў эксплуатацыю беларуская сталіца зможа прымаць і адпраўляць любыя з існуючых тыпаў паветраных судоў.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА: ШТО ГАРАНТУЕ ДЗЯРЖАВА?

Трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю? Не ведаеце, куды звярнуцца? Хочаце ўдакладніць, ці маеце права на дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу? А можа, ёсць пытанне наконт дзіцячых дапамог? Альбо трэба даведацца, якія перыяды работы ўваходзяць у страхавы стаж пры назначэнні пенсіі?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на прамой лініі госцю нашай рэдакцыі — **старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанне Аляксандраўне РАМАНОВІЧ**. Тэлефануйце 9 лістапада з 10 да 11 гадзін па тэлефоне 8 (017) 287-18-71.

Папярэднія пытанні можаце даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

■ Армія

НАДЗЕЙНЫ І МОЦНЫ ШЧЫТ

Кіраўнікі ваенных ведамстваў Беларусі і Расіі прынялі важныя рашэнні, якія будуць садзейнічаць умацаванню бяспекі дзвюх краін

Сумесная калегія міністэрстваў абароны Беларусі і Расіі традыцыйна стала сведчаннем ваеннай інтэграцыі дзвюх дзяржаў. Падчас пасяджэння, якое адбылося ў Мінску, падвялі вынікі дзейнасці ваенных ведамстваў за мінулы год, вызначылі прыярытэтныя напрамкі работы на наступны, а таксама абмеркавалі шэраг пытанняў, накіраваных на забеспячэнне ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы.

Фота БЕЛТА.

— Сёння можна сказаць, што калектыўная абарона Беларусі і Расіі — гэта не толькі надзейны і моцны шчыт двухбаковых адносін, а і важны элемент калектыўнай бяспекі АДКБ на заходнім напрамку, — адзначыў **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.** — За гады нашага супрацоўніцтва дасягнуты значныя вынікі. У першую чаргу гэта стварэнне і далейшае ўдасканаленне рэгіянальнай групоўкі войск. Працягваецца планамернае развіццё аб'яднаных ваенных сістэм разведкі, сувязі, радыёэлектроннай барацьбы, тылавога і тэхнічнага забеспячэння. Рэгулярныя сумесныя вучэнні пацвярджаюць высокі ўзровень беларуска-расійскага ўзаемадзеяння ў ваеннай сферы і ўмацавання пазіцый Саюзнай дзяржавы як гаранта ваеннай бяспекі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне.

Галоўным мерапрыемствам падрыхтоўкі органаў ваеннага кіравання і войск дзвюх краін у наступным годзе стане сумеснае аператыўна-стратэгічнае вучэнне ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017», якое пройдзе ў верасні.

— Практычныя дзеянні войск плануецца адпрацаваць адначасова на некалькіх палігонах Расіі і Беларусі, — удакладніў **міністр абароны Расійскай Федэрацыі генерал арміі Сяргей ШАЙГУ**. — Пры распрацоўцы задумы і сцэнарыя вучэння будзе ўлічана сітуацыя, звязаная з умацаваннем дзейнасці НАТА паблізу межаў Саюзнай дзяржавы.

Кіраўнік ваеннага ведамства Расіі закрануў тэму антытэрарыстычнай аперацыі ў Сірыі і падзякаваў беларускаму боку за гуманітарную дапамогу жыхарам гэтай краіны. «Беларусь адной з першых адгукнулася на нашу прапанову аказаць гуманітарную дапамогу сірыйскаму народу — гэта наглядны прыклад нашых саюзніцкіх адносін», — падкрэсліў Сяргей Шайгу.

Падчас пасяджэння калегіі быў падпісаны шэраг дакументаў, накіраваных на далейшае развіццё і паглыбленне ваеннага супрацоўніцтва. «Таксама сёння намі зацверджаны чарговы план супрацоўніцтва, рэалізацыя якога дазволіць у поўным аб'ёме развіваць двухбаковае супрацоўніцтва ў 2017 годзе, — перакананы Андрэй Раўкоў. — Хачу падкрэсліць поўнае ўзаемаразуменне, супадзенне пазіцый і адзінства меркаванняў па ўсіх пытаннях, якія абмяркоўваліся. Няма сумненняў, што паспяховае выкананне ўсіх запланаваных мерапрыемстваў дазволіць і надалей умацоўваць абароназдольнасць нашых краін і Саюзнай дзяржавы ў цэлым».

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

■

■ Дыялог бізнесаў

У В'етнаме будуць збіраць МАЗы

Айчынныя аўтамабілебудаўнікі выходзяць на рынак В'етнама. Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства прамысловасці, у Ханоі з'явіцца зборачныя вытворчасці «МАЗа». Новы імпульс у развіцці гандлёва-эканамічных адносін дзвюх краін нададуць дакументы, якія былі падпісаны ў ходзе афіцыйнага візіту ў В'етнам намесніка прэм'ер-міністра Уладзіміра СЯМАШКІ і міністра прамысловасці Віталя ВОЎКА.

У прыватнасці, бакі дамовіліся аб арганізацыі сумеснай вытворчасці пасажырскай і грузавой тэхнікі. Прычым беларуска-в'етнамскае прадпрыемства па зборцы грузавой тэхнікі «MAZ Asia» пачне функцыянаваць ужо сёлета. Яго гадавая вытворчая магутнасць будзе складаць 1500 адзінак. Цяпер вядзецца работа па запуску сумеснай вытворчасці аўтобусаў на 60 і 80 чалавек «MAZ-ZENIT».

Акрамя таго, у рамках 13-га пасяджэння беларуска-в'етнамскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, якое прайшло ў сталіцы В'етнама, падпісаны шэраг афіцыйных дакументаў, у тым ліку і на пастаўку беларускай аўтатэхнікі. Былі заключаны кантракты з кампаніяй «Auviet Industry JSC» на пастаўку ў 2017 годзе 200 адзінак аўтатэхнікі «МАЗ», 8 кар'ерных самазвалаў БелАЗ-7547 (грузападымальнасцю 45 тон) для патрэб кампаніі «Апатыт В'етнам». Паводле дамоўленасці, 56 адзінак аўтатэхнікі МАЗ плануецца рэалізаваць у Камбоджы, Філіпінах і Лаосе. Таксама бакі падпісалі пагадненне аб намерах паміж кампаніяй «БелАЗ» і карпарацыяй «Вінакамін» і мемарандум паміж кампаніямі «МТЗ» і «Mekong Machinery Co., Ltd.» на пастаўку трактароў «Беларус» у В'етнам у 2017 годзе.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Вышэйшая школа

Экспарт адукацыі з дастаўкай на дом

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Таджыкскі нацыянальны ўніверсітэт стварылі Сумесны Інстытут тэхналогій БДУ — ТНУ. Адпаведнае пагадненне падпісалі рэктары абедзвюх ВНУ акадэмікі Сяргей Абламейка і Махмадзюсуф Імамзода.

Адукацыйны працэс у Інстытуце тэхналогій будзе ажыццяўляцца па сістэме «2 + 2»: першыя два гады таджыкскія студэнты навучаюцца ў ТНУ (Душанбэ), а наступныя два — у БДУ. Абарона дыпломаў таксама будзе адбывацца ў Беларусі.

У складзе новай структуры прадугледжваецца функцыянаванне трох факультэтаў: інфармацыйных тэхналогій, эколагазберагальных тэхналогій і факультэта даўніверсітэцкай адукацыі. Сумесны факультэт інфармацыйных тэхналогій працуе ўжо другі год і зараз тут навучаюцца каля 100 чалавек. Студэнтаў рыхтуюць па спецыяльнасцях першай ступені вышэйшай адукацыі «прыкладная інфарматыка», «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі» і «камп'ютарная бяспека».

Факультэт эколагазберагальных тэхналогій ТНУ — МДЭІ імя А.Д. Сахарава БДУ будзе створаны ў жніўні гэтага года. Плануецца, што тут будуць рыхтаваць студэнтаў па спецыяльнасцях «энергаэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент», «ядзерная і радыяцыйная бяспека» і «медыка-біялагічная справа». А на факультэце даўніверсітэцкай адукацыі БДУ — ТНУ адкрыецца падрыхтоўка абітурыентаў па фізіка-матэматычным, хіміка-біялагічным і інжынерна-тэхнічным профілях.

Для даведкі: Таджыкскі нацыянальны ўніверсітэт быў створаны ў 1947 годзе. За ўсю гісторыю яго існавання падрыхтавана звыш 100 тысяч спецыялістаў. У цяперашні час у ТНУ навучаецца больш за 21 тысячу студэнтаў. Падрыхтоўка вядзецца па 93 спецыяльнасцях.

У структуры ўніверсітэта функцыянуюць 112 навукова-даследчых і навучальных лабараторый, Цэнтр біятэхналогій, Тэхнапарк, Цэнтр вывучэння моў, культурна-адукацыйны цэнтр «Канфуцый», Цэнтр перыёдыкі, друку і перакладу і іншыя.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Непагадзь

Змаганне са стыхіяй — у штатным рэжыме

Прыход у Беларусь цыклону не стаў нечаканасцю для камунальнікаў. Упершыню ў сезоне дворнікі Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей атрымалі поўную загрузку. Яшчэ загадзя па ўсёй краіне быў абвешчаны аранжавы ўзровень небяспекі, а муніцыпальныя службы і МНС прыведзены ў стан павышанай гатоўнасці. Пра гэта паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН, які з'яўляецца старшынёй камісіі па надзвычайных сітуацыях пры Савеце Міністраў.

Толькі ў сталіцы ў ноч з 1 на 2 лістапада выпала каля 5 сантыметраў снегу. Камунальнікі Мінска працавалі ў кругласутачным рэжыме: паводле слоў **намесніка генеральнага дырэктара па ідэалогіі і сацыяльных пытаннях ДВА «Гаррэмаўтадар Мінгарвыканкама» Андрэя ДЗЕМЕНЮКА**, на ўборку выехала каля 350 адзінак спецтэхнікі, расчысткай прыпынкаў грамадскага транспарту, падземных пераходаў займалася каля 750 чалавек. Вуліцы былі апрацаваны пры дапамозе 820 тон солі і 750 тон пясчана-салянай сумесі.

— Пакуль што мы працягваем працаваць у такім жа рэжыме, бо па прагнозах тэмпература будзе вагацца ў раёне «нуля», — расказаў спецыяліст. — Пры неабходнасці мы можам павялічыць колькасць тэхнікі і людзей на работах, у нас ёсць пэўны рэзерв. Да зімняга сезона мы падрыхтаваны поўнасцю.

Пэўна, адзінай установай, рэжым работы якой парушыла непагадзь, стаў Нацыянальны аэрапорт «Мінск». З-за неабходнасці апрацаваць самалёты вадкасцю супраць абледзянення чатыры ранішнія рэйсы вылецелі з затрымкай у 15-20 хвілін.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі з заўчаснай смерцю спецыяльнага карэспандэнта газеты «Звязда» па Гродзенскай вобласці ПРАКОПЧЫКА Барыса Георгіевіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Хакейныя «зоркі» запальваюцца тут!

Сёння на малой пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» стартуе дзясяты міжнародны хакейны турнір «Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба»

Ужо па традыцыі ў лістападзе ў Мінску збіраюцца наймацнейшыя гульцы свайго ўзросту. У спаборніцтвах прымуць удзел юніёрскія зборныя (U-16 і U-17) з Беларусі, Латвіі, Славакіі і Расіі.

Адзначым, што менавіта Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба з'яўляецца першым міжнародным турнірам па хакеі, які стаў праводзіцца ў нашай краіне на традыцыйнай аснове. Ён вядзе адлік сваёй гісторыі з 2007 года. У розны час на мінскі лёд у рамках гэтага турніру выходзілі сённяшнія «зоркі» сусветнага хакея — Яўген Кузняцоў, які стаў найлепшым бамбардзірам каманды НХЛ «Вашынгтон Кэпіталс», Артур Гаўрус і Яўген Ліcавец, якія сёння абараняюць колеры мінскага «Дынама» і нацыянальнай зборнай Беларусі. А, напрыклад, удзельнік турніру 2010 года Дзяніс Годла са Славакіі праз пяць гадоў стаў найлепшым варатаром маладзёжнага чэмпіянату свету. На гэтым турніры пачыналі свой шлях і шмат іншых вядомых спартсменаў.

Сёлета чакаецца асабліва ўпартая барацьба за кубак. Расіяне сабралі магутную каманду з гульцоў, якія выступаюць у сістэме клубаў Кантынентальнай хакейнай лігі. Беларуская дружына выступае разам з пачатку сезона ў Вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі. Славакі ўпершыню вязуць гульцоў адразу трох узростаў, каб нарэшце пазмагацца за трафей. Ростар дзеючых уладальнікаў кубка — латвійцаў — у асноўным складаецца з гульцоў «Рыгі-2000».

Нагадаем, турнір праходзіць па кругавой сістэме. У 2007, 2010—2013 гадах уладальнікамі кубка сталі хакеісты з Расіі. У 2008, 2009 і 2014 гадах перамогу атрымлівалі гаспадары спаборніцтваў.

Як і ў мінулым годзе, гульні можна будзе ўбачыць не толькі ўжывую (уваход на арэну вольны), але і на афіцыйным канале Прэзідэнцкага спартыўнага клуба на Youtube. Там будзе даступна прамая трансляцыя ўсіх паядынкаў турніру. Сёлета да малюнка матчаў дададуцца яшчэ і галасы вядучых беларускіх хакейных каментатараў.

Фота БЕЛТА.

3 лістапада
13.00 Расія — Латвія
15.25 Урачыстая цырымонія адкрыцця турніру
16.15 Беларусь — Славакія

4 лістапада
13.00 Славакія — Расія
16.15 Латвія — Беларусь

5 лістапада
13.00 Славакія — Латвія
16.15 Беларусь — Расія

Па заканчэнні апошняга матчу дня адбудзецца цырымонія ўзнагароджання, а таксама ўрачыстае закрыццё турніру.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■ Падпіска-2017

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

АД УСЁЙ ДУШЫ!

Насуперак лістападаўскай слоце мы зноў распачынаем шчырыя сустрэчы з чытачамі, якія так прыйшліся даспадобы сябрам нашай «Звязды».
Паверце, надвор'е — зусім не перашкода для таго, каб пабачыцца.
У наш імклівы час вельмі важна імкнуцца да таго, каб часцей вітаць адзін аднаго не па мабільніку ці ліставацца праз электронную скрыню, а зазірнуўшы ў вочы, апынуўшыся побач.
Прынамсі менавіта такім чынам мы і паступаем. Напярэдадні кожнага сезона распачынаем шпацыр па роднай Беларусі, дзе ў роднай газеты на роднай мове столькі сяброў. І, паверце, такія сустрэчы ладзім з вялікім задавальненнем.
Прызнаемся, падчас далёкіх падарожжаў па найпрыгажэйшых кутках нашай краіны неяк забываліся пра прысталічча, лічачы, што ўжо сюды абавязкова патрапім. Тым часам чытачы з Мінскага раёна справядліва дакаралі: маўляў, ніяк не завітаеце. Выпраўляем недахоп — заўтра пабачымся ў пасёлку Лясны, цэнтры Бараўлянскага сельсавета. 4 лістапада з 11 да 14 гадзін Дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца ў аддзяленні паштовай сувязі «Лясны-2». Спадзяёмся, што, нягледзячы на апошні працоўны дзень перад вялікімі выхаднымі і «нялётнае» надвор'е, сустрэча будзе цёплая.
Заходзьце — запрашаем ад усёй душы!

БЭБІ-БОКСЫ-БУМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У адным з выпадкаў маладая дзяўчына хварэла на ВІЧ-інфекцыю. Яна не толькі свядома заразіла свайго сужыцеля, пра што ён нават не здагадваўся, але і забіла іх агульнае нованароджанае дзіця, прычым з асаблівай жорсткасцю: нанесла яму мноства колата-рэзаных ран. Абцяжарваючыя абставіны пацягнулі за сабой адно з самых суровых пакаранняў — 12 гадоў пазбаўлення волі. А студэнтка з Туркменістана нарадзіла дзіця проста ў пакоі інтэрната БДТУ, а потым выкінула яго ў смеццевы пакет. Як высветліла следства, зрабіла гэта яна не свядома, а пад уздзеяннем псіхатраўмуючай сітуацыі. Улічваючы змякчаючыя акалічнасці, яе адправілі ў турму на два гады.

Не хацела станавіцца шматдзетнай маці дзвюх дачок з Пухавіцкага раёна, якая забіла трэцяе дзіця.

Фота gorod.lv

«Бэбі-бокс» у горадзе Валміера (Латвія) з'явіўся тры гады таму дзякуючы падтрымцы спонсараў. На той момант у Латвіі ўжо дзейнічалі «бэбі-боксы» ў Рызе, Ліепаі, Даўгаўпілсе, Рэзекне і Вентспілсе.

УВАГА, ДЗЕЦІ!

Падчас цяжарнасці і ў пасляродавы перыяд жанчына ў прынцыпе схільная да дэпрэсіўных станаў, а ва ўсіх гэтых выпадках будучыя маці не звярталіся па дапамогу да медыцынскіх спецыялістаў, нараджалі дома, у адзіноце, большасць з іх засталіся без падтрымкі мужчыны. Збег гэтых абставін мог справакаваць узнікненне часовых адхіленняў у паводзінах. Таму неабходна зрабіць усё, каб такі складаны працэс як роды праходзіў пад наглядам спецыялістаў.

Дарэчы, наладжана цеснае супрацоўніцтва міліцыі з медыцынскімі ўстановамі. Калі ніякай інфармацыі пра жанчыну, якая стаяла на ўліку і ўжо павінна была нарадзіць, няма — звесткі пра яе перадаюцца ў органы ўнутраных спраў для праверкі. Сістэма дзейнічае і наадварот: у тым выпадку, калі адразу не атрымалася выявіць асобу злачынцы, рассылаюцца запыты аб інфармацыі як у дзяржаўныя, так і ў прыватныя клінікі, у тым ліку і каб праверыць тых, хто планаваў перапыніць цяжарнасць, а пасля адмовіўся. Асаблівая ўвага надаецца нядобранадзейным сем'ям.

Паводле слоў спецыяліста, нароўні з тэмай пазбаўлення ад нованароджаных не менш важнай праблемай з'яўляецца забойства дзяцей і пакіданне іх у сітуацыі, небяспечнай для жыцця. Ва ўсіх на слыху справа аб гомельскіх «бацьках», дзіця якіх ператварылася ў мумію, ці пра жыхарку сталіцы, якая не пабаялася пакінуць немаўля сам-насам з галодным сабакам. Так што выратаванне дзяцей у першыя дні існавання — гэта справа гіперважная, аднак далёка не адзіная: неабходна стварацца ім годныя ўмовы жыцця.

Што датычыцца раскрывальнасці такіх злачынстваў, то доля тут высокая: ад 75 да 100% у залежнасці ад года. Напрыклад, сёлета было зарэгістравана 3 выпадкі забойства немаўлят: усе злачынствы ўжо раскрытыя. Часам атрымліваецца напасці на след злачынцы і праз 5-10 гадоў. Так, нядаўна была закрытая справа 2004 года. Жанчыны, якія дома нараджаюць мёртвае дзіця, часта імкнуцца пазбавіцца ад яго, што, у выпадку выяўлення, можа пацягнуць за сабой разбіральніцтва. Значна лепш самастойна заявіць пра здарэнне, а ў ідэале, каб яго прадухіліць, — у абавязковым парадку да родаў звярнуцца да ўрача.

— Чалавечае жыццё — гэта найвышэйшая каштоўнасць, і трэба прыкладаць усе намаганні, каб яго захаваць. Калі бэбі-боксы дапамогуць выратаваць хоць бы некалькі немаўлят, іх неабходнасць бясспрэчная, — падкрэсліў Віктар Юзэфовіч.

ШТО ТАКОЕ БЭБІ-БОКСЫ?

Бэбі-бокс — гэта спецыяльна абсталяваная ячэйка-калыска ў памяшканні медыцынскага або сацыяльнага цэнтра, у якой можна ананімна пакінуць немаўля. Для таго, каб гэта зрабіць, не трэба заходзіць унутр і з кім-небудзь мець зносіны: пакласці туды дзіця можна праз акно, як толькі дзверцы бэбі-бокса будуць зачыненыя, ва ўстанове пачуецца гучны сігнал, які абвяшчае аб з'яўленні новага адказніка. Асобу жанчыны, якая пайшла на такі крок, устанавіць немагчыма: побач не павінна быць аховы і відэакамер. У абсалютнай ананімнасці асноўнае адрозненне ад іншых спосабаў адмовы ад дзіцяці. Каля бэбі-боксаў традыцыйна размяшчаюць кантакты грамадскіх і рэлігійных арганізацый, якія могуць дапамагчы маці, калі яна ўсё-такі перадумае.

Ідэя такога прыёмніка далёка не новая: у розных формах яны былі шырока рапаўсюджаны яшчэ ў сярэднія вякі. Першае «кола падкідышаў» было створана ў Італіі ў канцы XII стагоддзя. Для гэтых мэт выкарыстоўвалася цыліндрычная прылада, якая была ўманціравана ў вонкавую сцяну будынка. Пасля таго, як жанчына клала дзіця ўнутр, яна круціла цыліндр і немаўля аказвалася ўнутры манастыра або прытулку. Ролю апавяшчальніка выконваў званочак. Тады на такі крок жанчын штурхала ганьба за нараджэнне дзіцяці па-за шлюбам, цяпер — нежаданне браць на сябе адказнасць.

У некаторых краінах Еўропы бэбі-боксы шырока распаўсюджаныя да гэтага часу, напрыклад, у Германіі. У іншых краінах, як у Вялікабрытаніі і Бельгіі, яны пад забаронай, а ў Францыі і наогул ёсць паняцце — ананімныя роды. У суседняй Расіі першыя бэбі-боксы з'явіліся ў 2011 годзе, што выклікала масу спрэчак у грамадстве, якія не сціхаюць да гэтага часу. Цяпер вядзецца абмеркаванне поўнага адмаўлення ад гэтай ініцыятывы. У Беларусі пра ўкараненне «вокнаў жыцця» ўпершыню загаварылі ў 2009 годзе, аднак законапраект так і не быў прыняты. Зараз краіну накрыла новая хваля дыскусій на гэтую тэму.

З аднаго боку, з'яўленне бэбі-боксаў, дзякуючы іх ананімнасці, павінна прывесці да скарачэння колькасці выкінутых немаўлят і памерлых з-за адсутнасці догляду дзяцей. Аднак досыць вялікі працэнт такіх выпадкаў рэгіструецца ў вёсках і невялікіх гарадах, у кожным з якіх бэбі-бокс, натуральна, не ўсталюеш. А ці гатовыя «маці» абцяжарваць сябе паездкай у адносна буйны населены пункт — яшчэ пытанне. Пры гэтым з жанчын цалкам здымаецца адказнасць за стан дзіцяці: калі на яго целе ёсць раны або пашкоджанні, устанавіць, як гэта адбылося, не ўяўляецца магчымым. Да таго ж ускладняецца працэс кантролю сітуацыі органамі ўнутраных спраў: заўсёды можна засцерагчыся тым, што дзіця не знікла, а было ананімна аддадзена.

Не хацела станавіцца шматдзетнай маці дзвюх дачок з Пухавіцкага раёна, якая забіла трэцяе дзіця.

Адразу і да плюсаў, і да мінусаў можна аднесці тое, што нават пры вялікім жаданні такому дзіцяці не ўдасца адшукаць сваіх біялагічных бацькоў. Гэта можа здацца станоўчым бокам для тых, хто збіраецца ўсынавіць немаўля. Магчыма, гэтыя людзі нават гатовыя будуць укласці свае сродкі ў дарагі праект. У ідэале, калі асноўнай функцыяй бэбі-боксаў стане інфармацыйная: жанчыны знойдуць звесткі аб службах падтрымкі і адумаюцца. Але гэта ў ідэале... А пакуль трэба шукаць магчымасці, каб дзецям не даводзілася прасякаць сабе «акно ў жыццё» самастойна.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

ГЭТА ЎСЁ ЭСТРАГЕНЫ?

Псіхічныя і паводзінскія расстройствы цягам шасці месяцаў пасля родаў сустракаюцца нярэдка, асабліва калі гаварыць аб пасляродавай дэпрэсіі або трывожных станах.

— Пасляродавы псіхоз — цяжкая праява псіхічнага расстройства, але гэта стан досыць рэдкі, сустракаюцца літаральна 1-2 выпадкі на 1000 родаў, — адзначае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Ірына ХВАСТОВА**. — Не трэба блытаць псіхоз, які развіўся пасля родаў, з абвастрэннем пасля родаў псіхічнага расстройства, ад якога жанчына пакутавала раней.

Галоўнай прычынай развіцця пасляродавых псіхозаў лічыцца раптоўнае і рэзкае зніжэнне ўзроўню эстрагенаў. Дадатковы, але не асноўны, уклад могуць унесці нейкія псіхалагічныя і сацыяльныя фактары. Рызыка развіцця такіх станаў вышэй у жанчын, якія нараджаюць першынца; у адзінокіх маці; калі роды адбываліся шляхам кесарава сячэння; калі дзіця памерла да або адразу пасля родаў; калі раней роды ўжо суправаджаліся пасляродавым псіхозам. Такі стан суправаджаецца бяссонніцай, нязвыклымі паводзінамі, узбуджэннем, трызненнем і галюцынацыямі. Галоўную ролю ва ўсіх перажываннях іграе непасрэдна нованароджаны — узнікае страх нашкодзіць яму, страшна, што ў яго ёсць нейкія захворванні і г.д. Знаходзячыся ў такім стане, жанчына сапраўды можа нашкодзіць немаўляці.

Па некаторых звестках, рызыка забойства дзіцяці ўласнай маці дасягае ў пасляродавы час 4-х працэнтаў. Вось чаму мы кажам, што жанчыны, якія толькі сталі матулямі, маюць асаблівую патрэбу з боку блізкіх у пяшчоце, клопаце, увазе. Пры першых прыкметах псіхічнага расстройства ім неабходна арганізаваць кансультацыю ўрача-псіхіятра або псіхатэрапеўта.

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

ТУТ СОНЦА ЎЗЫХОДЗІЦЬ НА ХВІЛЮ РАНЕЙ

Без хіміі і радыенуклідаў

А яшчэ тут ёсць вёска Ветка, якая знаходзіцца так далёка ад райцэнтра, што яе называюць Індыяй. Яна хаваецца ў лесе і славіцца сваімі маляўнічымі краявідамі. Сёлета расіяне разбілі тут палатачны лагер і атрымлівалі асалоду ад зносін з прыродай. У будучым плануецца развіваць прымежны турызм, запрашаць дзяцей на аздараўленне. Наогул Хоцімскі раён самы экалагічна чысты ва ўсёй вобласці. Тут унікальная прырода, яе не кранула аварыя на Чарнобыльскай АЭС і хімія вялікай прамысловасці.

— Наш край быццам створаны для аграэкатурызму, — кажа **намеснік старшыні райвыканкама Жанна БЕЛІКАВА**. — Пры правільным вядзенні гэтага бізнесу тут можна зарабіць неблагі капітал. Не менш перспектыўныя напрамкі — сельская гаспадарка і прамысловасць. Некалькі мінскіх фірм, напрыклад, зацікавіліся трэпелам. Іх падштурхнулі менавіта прыферэнцыі, якія гарантуе 235-ы Указ. Пакуль проста зарэгістравалі прадпрыемства. Спачатку плануюць правесці геолага-разведачныя работы. А потым наладзіць вытворчасць па ўзбагачэнні трэпелам угнаенняў.

«Ільняныя» грошы

Хоцімску не пашчасціла знаходзіцца на перасячэнні вялікіх чыгуначных ці аўтамабільных шляхоў, але гэта не значыць, што тут нельга наладзіць бізнес. Сакрэтам, як гэта зрабіць, падзяліўся дырэктар тутэйшага льнозавода Мікалай Курзянкоў. «Трэба працаваць», — аўтарытэтна заяўляе ён. Калі ў 1987 годзе Мікалай Ягоравіч стаў кіраўніком зусім неперспектыўнай гаспадаркі, ніхто не спадзяваўся, што яна акажацца адной з лепшых у вобласці. «У той час ішла гаворка аб закрыцці пяці льнозаводаў — Хоцімскага, Касцюковіцкага, Краснапольскага, Быхаўскага і ў Мсціслаўскім раёне, — узгадвае дырэктар. — Чатыры закрылі, а наш дагэтуль працуе. У 1987 годзе балансавы кошт гаспадаркі ацэньваўся ў 975 тысяч рублёў па тых грошах, за 4 гады я яго давёў да 2,5 мільёна. Калі прыйшоў сюды, гаспадарка «ляжала» — людзей не было, нічога не было. Пачалі вазіць і прадаваць крышталь, мэблю, машыны, дываны, кабельную прадукцыю, забяспечваў нават Мінскую вобласць. Вазілі з Яраслаўскай вобласці крышталь — з Дзяцькава. Тады гэта не забаранялася. І грошы пайшлі. Я іх укладваў у развіццё. Так і падняліся за кошт перавозак і продажу. Пабудавалі навесы, шохі для захоўвання сыравіны, арачныя склады, адміністрацыйны будынак, жыллё для работнікаў — мы былі адзіныя ў Хоцімску, дзе не існавала праблем з кватэрамі. Вось і зараз трымаемся толькі за кошт таго, што працуем.

Вынікі кажуць самі за сябе, у шафе ўсе палічкі заняты ганаровымі граматамі і дыпломамі абласнога і раённага ўзроўняў. У Хоцімску гэта адно з валаўтваральных прадпрыемстваў. Цалкам выконвае дзяржзаказ, зарабляе валюту. Пастаўляе сваю прадукцыю ў Прыбалтыку і Расію.

— Тэхналагічны працэс наладжаны, спецыялісты на сваім месцы, рабочых дастаткова, заробак своечасова выплачваем, — кажа дырэктар. — Сярэдні заробак сёлета 564,8 рубля. Паказчыкі ўсе выконваем, выручка на 1 рабочага 130% да ўзроўню мінулага года. Два гады запар займалі сярод ільнозаводаў першае месца па вобласці, сёлета крыху падвяло надвор'е, але спадзяёмся, што вынікі таксама будуць не горшыя, чым у астатніх. А галоўнае, у нас ёсць свае грошы і ўсе праблемы мы вырашаем самі, ні ў каго нічога не просім.

Кацярына ГВОЗДЗЕВА хутка знаходзіць з дзеткамі агульную мову.

Зрабіў комплекс для адпачынку з альтанкамі, лазняй, спальнымі пакоямі. І ўсё гэта з відам на возера, дзе шмат лебедзяў. Тут прыгожыя птушкі абзаводзяцца нашчадкамі, якія растуць на вачах. Назва для аграсядзібы сама напрошвалася — Белы лебедзь.

Калісьці бізнесмен працаваў на льнозаводзе, потым у ПМК, але не шкадуе, што заняўся сваёй справай. Некалькі гадоў таму купіў за 1 базавую паўразбураную ферму, адрамантаваў і зараз вырошчвае там свіней для патрэб сваёй аграсядзібы і крамы. Стравы з мяса Аляксандр гатуе не горш за дыпламаванага кухара. Мяса, кажа, экалагічна чыстае. Ніякіх камбікармоў, толькі сваё збожжа. Угнаенні выключна арганічныя. У гаспадарцы 13 гектараў ворнай зямлі і каля 8 гектараў падсобных зямель — ёсць дзе збіраць ураджай. Былі, праўда, спачатку цяжкасці з апрацоўкай. Баршчэўніку, узгадвае, знішчаў амаль па два гектары. Яшчэ цяжэй было араць там, дзе трапляліся нейкія падмуркі. Але зямлю не выбіраў. Працаваў на тым, што далі, ні на што не скардзіўся. Зараз не толькі сабе на хлеб зарабляе, але яшчэ і 7 працоўных месцаў стварыў. Акрамя аграсядзібы і крамы, ёсць свая піларама. Сын, гледзячы на гаспадарлівага бацьку, таксама на радзіме застаўся. Зараз і ў яго свой бізнес.

— У мяне ў свой час была магчымасць застацца ў Рызе, але прыехаў дадому, абняўся з бацькамі — і так соромна стала за свае думкі. Траіх дзяцей вырасцілі, а жывуць адны. І — застаўся. Цяпер ні кроплі не шкадую, — кажа Аляксандр. — Хоцімскі раён бедны толькі на першы погляд. Але ён можа прыцягнуць не толькі прыродай, а яшчэ радовішчамі гліны, трэпелу. Можна было б нават завод пабудаваць цагляны. А то ездзім у Расію за цэглай. Раней у нас было некалькі такіх заводаў.

Работа для маладога спецыяліста

Сёлета на работу ў Хоцімскую райбальніцу прыбыло 6 маладых спецыялістаў з Віцебскага, Гомельскага, Мінскага медуніверсітэтаў. Ім адразу выдзелілі жыллё, матэрыяльна заахвоцілі за складанасць і напружанасць працы. «Магчыма нехта і застанецца, — мяркуе **галоўны ўрач, таксама нядаўні малады спецыяліст Кацярына ІШУЦІНА**. — Я, напрыклад, некалькі гадоў таму атрымала размеркаванне ў Клімавічы, але прыехала ў камандзіроўку ў Хоцімск і вырашыла тут застацца. Заробак добры і адразу далі двухпакаёўку. Для параўнання: у Магілёве складана нават з інтэрнатам. Ды і з кар'ерай атрымалася нядрэнна. Працавала спачатку акушэрам-гінеколагам, потым стала загадчыцай паліклінікі, а зараз — галоўны ўрач.

Хоцімскі раён самы экалагічна чысты ва ўсёй вобласці. Тут унікальная прырода, яе не кранула аварыя на Чарнобыльскай АЭС і хімія вялікай прамысловасці.

Бальніца абслугоўвае Хоцімск і раён. На ўзбраенні ёсць сучасная тэхніка, напрыклад, шматфункцыянальны апарат УГД — спонсарская дапамога Нацбанка. Такіх у краіне не шмат. Урач Альфонс Хрол, які займаецца дыягностыкай, кажа, што апарат вельмі добры, ступень дакладнасці дыягназаў атрымліваецца высокая. Можна зрабіць нават УГД сэрца і сасудаў, не кажучы пра ўсё астатняе.

Не сумуюць без справы і маладыя спецыялісты. «Прыехала летам і цалкам акунулася ў работу, — усміхаецца **педыятр Кацярына ГВОЗДЗЕВА, нядаўняя выпускніца Мінскага медуніверсітэта**. — На 2066 дзетак у нас усяго два педыятры, плюс раён далі — працуем і працуем». Уражанні ад Хоцімска ў дзяўчыны станоўчыя: горад чысты, акуратны, людзі больш добрыя ў параўнанні з жыхарамі вялікіх гарадоў. Не выключае, што застанецца і пасля адпрацоўкі. Але бліжэйшыя 5 гадоў будзе тут.

З вышыні палёту

У Хоцімска два адметныя культурныя аб'екты — Свята-Троіцкі сабор і каруселі. Яны нават знаходзяцца па суседству, праз дарогу. Храм уваходзіць у спіс гісторыка-культурных помнікаў Рэспублікі Беларусь. «Звязда» ўжо неаднаразова пісала і пра яго, і пра настаяцеля архімандрыта Кірыла Бадзіча, які вярнуў гэтую святыню да жыцця. Што датычыцца каруселяў, то сярод іх ёсць наогул унікальныя. Чаго, напрыклад, варта адно кола агляду. Такога няма нават у Магілёве. А тут паспяхова працуе, катае дзетак і дарослых. Не стаяць без справы і пяць астатніх каруселяў — дзіцячыя «Космас», «Юнга» (караблік) і «Рамонак», і дарослыя — «Сюрпрыз» і «Арбіта». Захавалася нават танцпляцоўка з савецкіх часоў — знаходзіцца побач, і летам там заўсёды па вечарах танцы. Наогул з мая па кастрычнік тут не змаўкаюць галасы. У выхадныя і на святы збіраюцца адпачывальнікі не толькі з бліжэйшых Касцюковіч і Клімавіч, але нават і з Расіі. Прыязджаюць з дзецьмі, каб пакатацца, а потым зайсці ў кавярню і з'есці марожанага.

— За лета толькі на расіянах зарабілі 840 рублёў новымі, — кажа **дырэктар парка культуры і адпачынку Канстанцін АНДРЭЕЎ**. — Аткракцыёны ўнікальныя, ім па 30 гадоў, але ўсе працуюць. Яшчэ 2 батуты ставім. І дзеці бягуць сюды з задавальненнем. Побач школа, два садкі. Білеты танныя — дзіцячыя 60 капеек, дарослыя — рубель, кола агляду — рубель дваццаць. Чаму не катацца?

Даведка «Звязды»

Хоцімскі раён — самы ўсходні ў Беларусі, знаходзіцца за 430 кіламетраў ад Мінска, 200 — ад Магілёва, 150 — ад Бранска і 180 кіламетраў ад Смаленска. На яго тэрыторыі 5 заказнікаў дзяржаўнага і мясцовага прызначэння, 10 помнікаў прыроды мясцовага значэння. Фаўна прадстаўлена багатым жывёльным і птушыным светам, шмат відаў занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі. Тут ёсць нават паселішчы чорнага бусла. У раёне маюцца буйныя радовішчы трэпелу, сапрапеляў і гліны. Радовішча прыродных трэпелаў «Стальная» падрыхтавана да прамысловага асваення і з'яўляецца найбуйнейшым у Беларусі. А запасы сапрапелю, які прызначаны для гаспадарчых патрэб, складаюць прыкладна 136 тысяч тон. Мясцовыя ўлады таксама зацікаўлены ў развіцці праектаў па аграэкатурызме, дрэваапрацоўцы і прыдарожным сэрвісе. Усяго тут сфарміраваны тры дзеючыя інвестпляцоўкі і 13 перспектыўных.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

У Хоцімск прыязджаюць спецыяльна пакатацца на «чортавым коле».

На сённяшні дзень у раёне зарэгістраваныя 151 індывідуальны прадпрымальнік, 24 прыватныя прадпрыемствы і 13 сялянска-фермерскіх гаспадарак. З пачатку года зарэгістраваны 24 прадпрымальнікі, 4 таварыствы з абмежаванай адказнасцю, 1 прыватнае прадпрыемства і 4 спажывецкія кааператывы. На адкрытых прадпрыемствах і вытворчасцях сёлета створана 28 працоўных месцаў. Бурнай дзейнасці пакуль не назіраецца, але раней столькі ўсяго не стваралася. Актывізаваліся і тыя бізнесмены, якія ў нас ужо былі. Напрыклад, прадпрымальнік Арыф Аліеў выкупіў летась будынак, будзе рабіць маладзёжную і дзіцячую кавярні з нацыянальнай кухняй.

Ёсць зрухі і па іншых накірунках. Будуецца 40-кватэрны дом, дзе будучым навасёлам будзе выдадзены крэдыт пад 1%. З пачатку года ў Хоцімску рэалізуецца праект на суму болей 600 тысяч еўра міжнароднай тэхнічнай дапамогі па раздзельным зборы адходаў і іх утылізацыі. За кошт ПРААНаўскіх сродкаў закуплены два MANы, адзін пагрузчык, 180 кантэйнераў для раздзельнага збору смецця, 8 велікагрузных кантэйнераў, прэс. Насельніцтва пакрысе вучыцца сартаваць смецце.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І белы лебедзь з сажалкай

Аляксандр Кастэнка — адзін з тых прадпрымальнікаў, якія не абыякавыя да будучай сваёй спадчыны.

У гарадскім пасёлку вучацца раздзяляць смецце.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

3 ЛІСТАПАДА 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15804)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Гурт AILLION:

«Мы не «дыназаўры»

Здаецца, час шырокага захаплення моладзі класічным рокам і металам мінуў. Даўно забытыя, у шафах вісяць скураныя курткі-«касухі», некалі доўгавалосыя хлопцы носяць кароткія стрыжкі, а чорная майка з выявай любімага гурта перастала быць абавязковым атрыбутам металіста. Таму музыку мінскага гурта Aillion можна лічыць пэўнага кшталту анахранізмам: яны ўсё яшчэ граюць стары добры heavy-metal. І, дарэчы, з'яўляюцца досыць паспяховай камандай. Пра тое, чым жыве гурт сёння, якая публіка прыходзіць на канцэрты хлопцаў і чаму сцэнічныя куміры цяпер ператвараюцца ў настаўнікаў, мы гутарым з вакалістам Aillion Канстанцінам ДУДАРАВЫМ і гітарыстам Дзмітрыем МІКУЛІЧАМ.

— Сёння многія музыканты іграюць у модных стылях пост-року, пост-металу. А вы — традыцыйны, амаль класічны heavy-metal. Чаму так?

Канстанцін: — Хто яго ведае. Яшчэ ў часы «Стаі» (гурт, які і стаў «адпраўной кропкай» для Aillion. — **Аўт.**) мы сябе пазіцыянавалі як heavy-metal каманда, але тады гэта была, хутчэй, «фішка». Цяпер проста граем музыку, якая ў нас атрымліваецца. Магчыма, яна па стылі сапраўды больш нагадвае класічны heavy-metal, але мне падаецца, што нельга толькі так ахарактарызаваць нашу музыку.

Дзмітрый: — Я думаю, што можна. Хоць у нас многа эксперыментаў у музыцы — аранжыроўках, інструментоўцы, кампазітарстве, але нам падабаецца менавіта чысты моцны вакал, што з'яўляецца класікай жанру heavy-metal.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Пазнаёміцца з прафесіяй

Кветкі ад Гошы,

ці Кемлівы конь — знаходка для цырка

Калі артыстка Белдзяржцырка Вольга ДЗЯГІЛЕВА апранае каўбойскі ўбор і выходзіць на манеж, яе гадаванцы таксама ператвараюцца ў сапраўдных коней з вестэрна. А яны на Дзікім Захадзе ўмеюць усё: могуць ветліва кланяцца гасцям, а ў час небяспекі прыкідвацца мёртвымі. Могуць танцаваць, а могуць сядзець, падабраўшы заднія ногі. Калі ж гаспадыні сумна, разумная істота адшукае букецік кветак і аддасць яго ў рукі. І ўсё гэта без ніякага прымусу...

Выступленні на сцэне пачаліся для мінчанкі Вольгі ў чатыры з паловай гады. Бацькі напачатку аддалі дзяўчынку ў харэграфічную студыю, а ў шэсць гадоў яна трапіла ў дзіцячы ансамбль «Равеснік». На той час калектыў прадстаўляў Беларусь ледзь не на кожным творчым конкурсе, два разы на год былі абавязковыя выезды ў Маскву, выступленні ў дзіцячым лагеры «Артэк». І калі ў адзінаццаць Вольга вырашыла кінуць танцы, бацькі паставіліся да гэтага адмоўна, тым больш што дачка сама, без дазволу, запісалася ў коннаспартыўную школу.

— Конным спортам займалася сем гадоў, а потым без асаблівых ваганняў з'ехала ў вёску працаваць у калгасе на племянной ферме. У 1990-х гадах у коннаспартыўных школах было цяжка з фінансамі, не хапала коней. Калгасы ж якраз пачалі багацець, і лічылася прэстыжным прыбудаваць да асноўных фермаў спартыўную стайню. Туды пацягнуліся майстры спорту, сыходзілі нават прафесіяналы міжнароднага класа. Я тады паўгода як скончыла школу, мне прапанавалі — я і паехала. Знаёмым у Мінску такі ўчынак, напэўна, падаўся вар'яцкім, — успамінае Вольга.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Не ўпусціць галоўнае

ВЫХАВАННЕ НОН-СТОП

ЧАМУ КОЛЬКАСЦЬ НЕ ЗАЎСЁДЫ ПЕРАХОДЗІЦЬ У ЯКАСЦЬ?

Як можна вымераць эфект ад ідэалагічнай работы і ў якіх адзінках гэта рабіць? Рублі, сантыметры, грамы, кілаграмы ў дадзеным выпадку не падыходзяць. А можа, па колькасці выхаваўчых мерапрыемстваў, што праводзяцца ва ўстановах адукацыі? Па адсутнасці правапарушэнняў сярод школьнікаў і студэнтаў ці па колькасці маладых людзей, уцягнутых у дзейнасць грамадскіх маладзёжных арганізацый? Як увогуле можна ацаніць працу педработнікаў, якія нясуць адказнасць за ідэалагічнае выхаванне падрастаючага пакалення? Гэта толькі адно са шматлікіх пытанняў, што ўзніміліся ў ходзе калегіі Міністэрства адукацыі. Мерапрыемства было прысвечана ўдасканаленню ідэалагічнай работы ва ўстановах адукацыі: ад школы — да ВНУ.
Да таго ж эфект ад ідэалагічна-выхаваўчай работы можа быць як хуткім, так і доўгатэрміновым. Як трапна заўважыла начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ, «мы БелАЗы не выпускаем, а выхоўваем людзей, якія потым будуць рабіць БелАЗы».

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
3 11 2016 г.

Жыццёвы ўрок

ПРА АХОВУ ПРЫРОДЫ ДБАЦЬ З МАЛАДОСЦІ

З мэтай папулярызацыі экалагічных ведаў работнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь пастаянна працуюць са школьнікамі і студэнтамі.

На базе Лідскай і Светлагорскай міжраённых інспекцый былі арганізаваны экскурсіі адпаведна для старшакласнікаў гімназіі №1 і сярэдняй школы №8. У госці да мазырскіх дзяржінспектараў прыйшлі студэнты мясцовага педуніверсітэта. А супрацоўнікі Мікашэвіцкай міжрайінспекцыі самі наведалі гарадскую школу №2.

Дзяржінспектары пазнаёмілі хлопцаў і дзяўчат з асаблівасцямі сваёй службы: прадэманстравалі тэхніку (аўтамабілі, катары, квадрацыклы) і спецсродкі, якія дапамагаюць у рабоце (цеплавізары, біноклі і інш.). Расказалі аб адказнасці за браканьерства і патлумачылі, чаму ў Беларусі нельга лавіць рыбу сеткамі, калі і як можна здабываць ракаў, якія правілы трэба захоўваць, адпраўляючыся ў лес на адпачынак, па ягады і грыбы, праінфармавалі аб адказнасці за распальванне вогнішчаў у не прызначаных для таго месцах. Больш за іншае школьнікаў і студэнтаў здзівіў той факт, што дарослыя таксама здаюць экзамены, напрыклад, для таго, каб стаць паляўнічымі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Твой выбар

ХТО НЕ ЛЮБІЦЬ «БАБУЛЮ ГАННУ»?

Рэспубліканскае сацыялагічнае даследаванне «Маладзёжны брэнд» стартавала ў краіне. Яго праводзяць Маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў грамадскага аб'яднання БРСМ і асацыяцыя абароны інтэлектуальнай уласнасці «БелБрэнд». Мэта даследавання — вывучэнне папулярнасці беларускіх і замежных брэндаў і вытворцаў па асноўных групах харчовых і нехарчовых тавараў.

Гэта ўжо другое маштабнае сацыялагічнае даследаванне ў рамках супрацоўніцтва Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і асацыяцыі «БелБрэнд». Папярэдняе праводзілася ў лістападзе 2015 года. Тады было апытана больш за тысячу маладых беларусаў ва ўзросце ад 18 да 32 гадоў, якія прадстаўлялі асноўныя тэрытарыяльна-эканамічныя зоны нашай краіны. Іх запрашалі зрабіць выбар на карысць любімых вытворцаў ці гандлёвых марак па асноўных групах харчовых і нехарчовых тавараў.

Па выніках мінулага даследавання, сярод малочных прадуктаў найбольшай папулярнасцю ў моладзі карысталася прадукцыя кампаніі «Савушкін прадукт», сярод пельменяў — гандлёвая марка «Бабуля Ганна», а сярод марожанага — марка «Soletto».

Арганізатары маштабнага праекта заклікаюць: калі вам пашанцавала і вы патрапілі ў спіс рэспандэнтаў даследавання «Маладзёжны брэнд-2016», абавязкова падзяліцеся сваім бачаннем лепшых брэндаў, прадстаўленых у Беларусі.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ВЫХАВАННЕ НОН-СТОП

Тэст для прафесара

— Нярэдка за вялікай колькасцю выхаваўчых мерапрыемстваў мы не бачым канкрэтнага чалавека, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.** — Лічу недапушчальным неабгрунтаваныя патрабаванні розных мясцовых структур па правядзенні ва ўстановах адукацыі вялікай колькасці пазапланавых мерапрыемстваў...

— Свой план ідэалагічна-выхаваўчай работы можа мець і кафедра, і факультэт, і ўніверсітэт. Вось і атрымліваюцца разам тры сотні мерапрыемстваў. Але якія яны ставяць задачы, ці не дубліруюць адзін аднаго, ці захоўваецца іх пераемнасць і, галоўнае, ці дасягаюць яны сваёй мэты? — задаў зусім не рытарычнае пытанне **прарэктар па выхаваўчай рабоце Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Павел ПАПКО.**

Не сакрэт, што шмат мерапрыемстваў праводзіцца дзеля «птушачкі». Баранавіцкі ўніверсітэт прапанаваў свае крытэрыі для ацэньвання ідэалагічнай і выхаваўчай работы. Сярод іх, напрыклад, вызначэнне ідэалагічнай сталасці прафесарска-выкладчыцкага саставу. Яго прапануецца праводзіць у выглядзе тэсціравання ці гутаркі на этапе дзейнасці дзяржаўнай атэстацыйнай або акрэдытацыйнай камісіі па канкрэтнай спецыяльнасці. Пагадзіцеся, што і малады выкладчык, і сталы прафесар, якія не ў курсе сусветных і рэспубліканскіх падзей і не арыентуюцца ў інфармацыйных патоках, бо не маюць звычкі праглядаць штодня сродкі масавай інфармацыі, наўрад ці будуць карыстацца аўтарытэтам у сваіх студэнтаў... А чалавек, у якога ёсць праблемы ва ўласнай сям'і, не павінен быць для студэнцкай моладзі «кансультантам» ці дарадчыкам у сямейным выхаванні.

Аналіз аддаленых вынікаў ідэалагічнай і выхаваўчай работы прапануецца праводзіць на аснове інфармацыі з арганізацый, у якія былі размеркаваны студэнты, у прыватнасці, ацэнак з боку наймальнікаў якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, іх ідэалагічнай сталасці і выхаванасці. Плюс прапануецца аналізаваць таксама інфармацыю, атрыманую ад выпускнікоў: як яны самі ацэньваюць сваю падрыхтоўку, ці лічаць сябе канкурэнтаздольнымі спецыялістамі і сацыяльна актыўнымі членамі грамадства?

На першы курс ВНУ прыходзяць і школьныя медаліты, і пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў. Але што з імі адбываецца далей? Наколькі актыўна яны ўцягваюцца ў жыццё калектыву па-за вучэбнымі заняткамі (валанцёрства, студэнцкае самакіраванне, працу ў студатрадах і г.д.)? Гэта таксама даволі красамоўны паказчык...

«Навучаючы, выхоўваем»

— Дайсці да душы і свядомасці кожнага навучэнца — гэта майстэрства і вялікая праца. Таму ідэалагічныя работнікі павінны мець найвышэйшую кваліфікацыю, — упэўнены Віктар Якжык. — Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на маладых спецыялістаў. Неабходна ствараць умовы, якія спрыяюць росту і самаразвіццю асобы педагога, фарміраванню іміджу сучаснага педагога як носьбіта маральных каштоўнасцяў грамадства.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Асобна Віктар Якжык спыніўся на фарміраванні грамадзянскай кампетэнтнасці на ўроках. Па самых прыблізных падліках, за час сваёй вучобы ў школе дзіця наведвае больш як 10 тысяч самых розных урокаў. Таму выхаваўчы патэнцыял апошніх цяжка пераацаніць. Прычым гэта тычыцца абсалютна ўсіх вучэбных дысцыплін.

— Праблема выхаваўчага патэнцыялу ўрока і вучэбных прадметаў досыць востра паўстала пасля правядзення рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь». Адным з яго мерапрыемстваў было прадстаўленне ўласнага вопыту педагагічнай дзейнасці «Навучаючы, выхоўваю...». Не ва ўсіх педагогаў атрымалася сістэмна паказаць працу ў гэтым кірунку, — канстатаваў Віктар Якжык.

Бязвыплатнае донарства шырока практыкуецца ў еўрапейскіх краінах. Акцыя бязвыплатнага донарства — у Варшаўскім політэхнічным універсітэце.

У вышэйшай школе налічваецца 202 малатыражныя і 57 універсітэцкіх газет. У БДУ выпускаецца аж 14 студэнцкіх газет.

Працуе «Маладзёжнае телебачанне БДУІР». Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Таму ў рамках дзейнасці клуба «Хрустальны журавель», які аб'ядноўвае ўдзельнікаў і арганізатараў конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь», цягам двух гадоў вялася праца па даследаванні выхаваўчых магчымасцяў вучэбных прадметаў і іх рэалізацыі на школьных занятках. Вынікам стаў шэраг публікацый у сродках масавай інфармацыі, правядзенне майстар-класаў у рамках V Рэспубліканскага каляднага фестывалю педагагічнага майстэрства, метадычных выездаў клуба. Зараз рыхтуецца зборнік матэрыялаў «Выхаваўчы патэнцыял урока», які ўключае практычныя рэкамендацыі педагогам розных прадметаў.

Ад «ЖурФАКТаў» — да студэнцкага ТБ

Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, зараз у 51 вышэйшай навучальнай установе функцыянуюць 15 радыёгазет, 19 кіна-, відэа- і тэлестудый (у БДУІР, БДПУ, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце, БДАТУ). Вядзецца праца над праектам па стварэнні сеткі міжуніверсітэцкага студэнцкага відэаканала «Універсітэт-ТБ».

Практычна ўсе ВНУ маюць свае перыядычныя выданні. Усяго ў вышэйшай школе налічваецца 202 малатыражныя і 57 універсітэцкіх газет. У БДУ выпускаецца аж 14 студэнцкіх газет: «Vita», «Экватар», «Gumka», «ЖурФАКТЫ», «Вэб-журналіст», «Тайм-аўт», «Nika», «BUG», «ChemicalBoom», «ФМОn-line», «Infinity» і іншыя.

У шэрагу ВНУ практыкуецца публікацыя ў спецыяльных выпусках студэнцкіх газет адказаў на пытанні, якія паступаюць праз паштовыя скрыні «Пытанні да рэктара», размешчаныя ў навучальных карпусах, на факультэтах і ў інтэрнатах.

За два апошнія гады ў сацыяльных сетках «УКантакце» і «Facebook» былі створаны афіцыйныя групы Мінадукацыі і ўпраўлення па справах моладзі.

У папярэднім навучальным годзе ў афіцыйнай групе ўпраўлення па справах моладзі ў сацыяльных сетках былі рэалізаваныя патрыятычныя інтэрнэт-праекты «Радзіма

І малады выкладчык, і сталы прафесар, якія не ў курсе сусветных і рэспубліканскіх падзей, наўрад ці будуць карыстацца аўтарытэтам у сваіх студэнтаў.

вачыма студэнтаў», «Нашы людзі», «Мая Беларусь — мой выбар», фотапраект «За будучыню незалежнай Беларусі». Зараз праходзіць рэспубліканскі конкурс на лепшую групу ВНУ ў сацыяльных сетках. Яго вынікі будуць падведзены напрыканцы лістапада. Сумесна з Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта ў 2012—2015 гадах быў рэалізаваны праект «Разумныя сеткі».

Віктар Якжык звярнуў увагу на тыя недахопы, над якімі ВНУ давядзецца працаваць, у прыватнасці, на адсутнасць у шэрагу ўстаноў адукацыі сістэмнага кантролю за зместам інфармацыйных сродкаў, несвоечасовае абнаўленне стэндаў і інфармацыйных матэрыялаў, дызайн і змястоўнае напаўненне сайтаў. «Установам адукацыі ўсіх узроўняў варта пастаянна актуалізаваць інфармацыю ў інтэрнэт-прасторы, фарміраваць групы з навучэнцаў і выкладчыкаў для працы ў сацыяльных сетках», — дадаў намеснік міністра адукацыі.

Студэнты пакажуць прыклад?

У бліжэйшы час у беларускіх ВНУ плануюць запусціць «Рух бязвыплатнага донарства». Гэта сумесны праект Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства адукацыі.

— Бязвыплатнае донарства шырока практыкуецца сярод студэнцкай моладзі ў еўрапейскіх краінах і ў суседняй Расіі, — паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Фёдар КАРПЕНКА.** — Ад платнага донарства адмаўляюцца ва ўсім свеце. Беларусь плануе перайсці на бязвыплатнае донарства крыві да 2020 года. Вельмі спадзяюся на дапамогу прарэктараў па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце і аддзелаў, якія курыруюць выхаваўчую працу, у рэалізацыі нашага праекта. Сумесна будуць вызначаны валанцёры, праведзена агітацыя з удзелам арганізацый пераліванне крыві ў кожнай вобласці. **Для запуску праграмы будуць распрацаваны слоган і лагатып.** Графік прыезду арганізацый пераліванне крыві ў ВНУ будзе ўзгадняцца з Міністэрствам адукацыі.

Без наступстваў для здароўя здаваць кроў пры адсутнасці супрацьпаказанняў можна кожныя два месяцы, а плазму крыві — кожныя два тыдні. Донарства не аказвае шкоднага ўздзеяння на арганізм здаровага чалавека і не ўплывае на яго працаздольнасць, сцвярджаюць медыкі. Больш таго, для здаровага чалавека донарства крыві нават карыснае. Гэта навукова даказаны факт. Рэгулярнае донарства крыві стымулюе кроватварэнне, і, адпаведна, самаабнаўленне арганізма. Донары радзей хварэюць прастуднымі, сардэчна-сасудзістымі, анкалагічнымі захворваннямі, а таксама захворваннямі страўнікавакішачнага тракта. Актыўнае донарства — гэта яшчэ і прафілактыка атэрасклерозу, парушэнняў дзейнасці печані і падстраўнікавай залозы.

Ці атрымае ў Беларусі рух бязвыплатнага донарства такі ж размах, як у Еўропе, ці падтрымае наша грамадства высакародныя мэты, пакажа час. Ва ўсялякім разе медыкі на гэта вельмі спадзяюцца. А педагогі іх папярэджваюць: у выпадку прымусу і ціску на студэнтаў ёсць рызыка атрымаць адваротны эфект...

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Гісторыя ў маштабе

УБАЧЫЦЬ ПРАЗ МАДЭЛЬ МІНУЛАЕ

Адной уседлівасці тут мала

У цяжкія ваенныя часы рэцэптура фарбы не заўсёды вытрымлівалася, таму, напрыклад, славутыя «трыццацьчацвёркі» маглі быць як аліўкавымі з жаўтаватым адлівам, так і цёмна-зялёнымі. Для большасці з нас такія нюансы асаблівай цікавасці не прадстаўляюць, але для аматараў мадэлізму гэта справа прынцыповая. Мы паразмаўлялі з трэцякурснікам Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта Аляксандрам САЛАМ і даведаліся, што вабіць моладзь у гэтым занятку і чаму дробязі — гэта важна.

Фота Надзеі БУЖАН.

Узрост у мадэлізме асаблівай ролі не адыгрывае.

— Па «спецыялізацыі» я — «авіятар», — расказвае хлопец. — Больш за ўсё цікаўлюся самалётамі і верталётамі. Але пакуль, каб набрацца вопыту, часова вырашыў заняцца бранятэхнікай — у гэтым кірунку менш радыкальна ставяцца да невялікіх памылак. Калі на мадэлі самалёта ёсць хаця б дробненькая плямка, трэба ўсё змываць, зачышчаць і фарбаваць нанава. На бранятэхніцы гэта можна схаваць за скрыняй, тросам ці ўвогуле імітаваць пашкоджанне.

У выпадку Аляксандра цікаўнасць да тэхнікі — яшчэ і прафесійная. Ён вучыцца на інжынера-механіка, а таксама працуе па сумяшчальніцтве ў музеі аэраклуба, што ў пасёлку Баравая пад Мінскам — удзельнічае ў рэстаўрацыі старых самалётаў. Па словах хлопца, цікаўнасць да тэхнікі ў яго з'явілася яшчэ ў самым раннім дзяцінстве, але заняцца мадэлізмам раней замінала тое, што ў невялікім Скідзелі было цяжка знайсці мадэлі і патрэбную літаратуру. Паступленне і пераезд у сталіцу два гады таму развязалі рукі — хлопец адразу ж знайшоў тэматычныя крамы і заняўся любімай справай.

— У Мінску, праўда, збіраць мадэлі не атрымліваецца — жыву ў студэнцкім інтэрнаце, а гэта не лепшае месца для скрупулёзнай працы з дробнымі дэталямі, — усміхаецца Аляксандр. — Таму перавожу ўсё ў «майстэрню», якую абсталяваў дома ў Скідзелі. Чаму мне гэта цікава? Трэба разумець, што мадэлізм — гэта не проста хобі «дарослых дзяцей», якім падабаецца збіраць «канструктары». Трэба добра ведаць гісторыю — да якой эпохі адносіцца канкрэтная тэхніка, якія ў яе былі характарыстыкі, мадыфікацыі, дзе яна выкарыстоўвалася і шмат іншага. Ёсць спецыяльная літаратура для мадэлістаў, калі ў адным выданні сабрана абсалютна ўся інфармацыя пра пэўную баявую адзінку. Таму гэта яшчэ і своеасаблівы спосаб бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй.

— У мадэлізме ёсць некалькі кірункаў, — працягвае хлопец. — Самы просты — збіраць, што называецца, «са скрыні»: набываць пластыкавыя ці папяровыя наборы і рабіць усё па прыкладзеных чарцяжах. Самы складаны — самаробныя мадэлі, калі аматар сам збірае тэхніку са спадручных матэрыялаў. Але большасць (у тым ліку і я) знаходзіцца недзе пасярэдзіне: набываем наборы, але дапрацоўваем свае мадэлі і дадаем нейкія дэталі згодна з уласным бачаннем. Таму мадэлізм зусім не выключае магчымасць творчасці.

Тэма ваеннай тэхнікі вельмі шырокая і большасць аматараў гэтага занятку канцэнтруецца на асобных эпохах ці эпізодах.

Мадэль славутага танка Т-34, створаная рукамі Аляксандра. Вядома, ва ўласнай інтэрпрэтацыі і са сваім варыянтам афарбоўкі.

Напрыклад, у Аляксандра — гэта Другая сусветная вайна, а таксама аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Апошняя вельмі цікавіць якраз «авіятараў» — у ліквідацыі аварыі прымалі ўдзел верталёты Мі-26, Мі-8, Мі-6. Хлопцу ў гэтым сэнсе асабліва пашчасціла — у музеі аэраклуба ёсць адзін Мі-26, які займаўся дастаўкай грузаў у зону аварыі. Удзелу непасрэдна ў тушэнні пажару машына не прымала, таму яе радыяцыйны фон адпавядае норме. Акрамя таго, мадэліст асабіста размаўляў з некаторымі ліквідатарамі аварыі, каб высветліць пэўныя тэхнічныя моманты. Цяпер ён збірае грошы на аэрограф (спецыяльны распыляльнік, якім фарбуюць мадэлі), каб вярнуцца да сваёй любімай тэмы.

— Мадэлізмам спрабуюць займацца многія, — заўважае Аляксандр. — Але рабіць гэта добра могуць далёка не ўсе. Мяркую, што галоўнае для такога хобі — шчырая цікаўнасць да тэхнікі і гісторыі, а таксама ўседлівасць. Бо без цікаўнасці наўрад ці магчыма атрымаць задавальненне. А без уседлівасці сабраць нешта добрае не атрымаецца, паколькі справа адымае не некалькі гадзін і нават дзён — вялікія дэталізаваныя мадэлі ствараюцца па некалькі гадоў. Уявіце сабе, якой сканцэнтраванасці гэта патрабуе ад аўтара. Што датычыцца мяне, то пасля атрымання дыплома я вярнуся працаваць у Скідзель. Але хобі сваё дакладна не закіну.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

ProFit
З Наталляй Лубнеўскай

МЕНШ ДУМАЙЦЕ ПРА ЕЖУ

Баюся людзей, якія сядзяць на дыетах. Побач з імі я, аматар паесці, адчуваю сябе няёмка. Нядаўна ехала ў цягніку побач з маладой жанчынай. Бачыла яе ўпершыню, але ўжо праз паўгадзіны дакладна ведала адно: яна на дыеце. За гэты час мая спадарожніца некалькі разоў настойліва спрабавала накарміць мужа (сама ж перакусіць не можа — худзее) і завочна адчытала сяброўку, якая вячэрае пасля 22.00. Ехаць разам нам было чатыры гадзіны. Я, як на злосць, дома не паснедала, збіралася паесці ў цягніку. Але дастаць бутэрброды пад пільным позіркам суседкі на дыеце так і не адважылася.

Яшчэ адну гісторыю расказала знаёмая. Яна была на семінары, які вяла лектар-сыраед. Ну вы ведаеце, адна з тых, хто не есць варанага, смажанага, салёнага і перабіваецца гароднінай ды садавіной. Ніхто гэтай акалічнасці не надаў бы ўвагі, калі б тая лектар не жавала ўвесь семінар (які, дарэчы, зусім не быў звязаны з тэмай здаровага ладу жыцця). Колькі салаты ды агуркоў каштаваў майстар-клас арганізатарам, не падлічыць.

Разумею, калі новы рацыён сапраўды падабаецца і ідзе на карысць (палова маіх аднакласнікаў былі вегетарыянцамі яшчэ да таго, як гэта стала папулярным: адмаўляліся ад гуляшу ў школьнай сталоўцы). А калі проста даніна модзе... Найбольш здзіўляюць хлопцы, якія вырашылі жыць на яблыках і соках. Адзін фруктарыянец з Гомеля неяк вёў відэаблог. Падпісчыкаў хапала. Праўда, большасць цікавілася не вынікамі, якіх дабіўся хлопец такой дыетай, а тым, ці не растварыўся ён у паветры.

Ведаеце, у чым сакрэт дзяўчат, якія ядуць што заўгодна і не паўнеюць? Яны проста не «заганяюцца» наконт харчавання.

Чамусьці прынята думаць, што калі твой рэжым харчавання прыносіць пакуты і нязручнасці (навакольным у тым ліку), значыць, усё робіш правільна. З нецярпеннем чакаеш раніцы, каб з'есці цукерку (да паўдня, кажуць, можна есці ўсё), а па начах сняцца піражкі з сёмгай? Так і трэба. Маўляў, нічога страшнага, крыху пацерпіш, затое потым эфект будзе. Не будзе. Па-першае, метабалізм — рэч крыўдлівая: запомніць і адпомсціць. Па-другое, псіхалагічны стрэс, які ўвесь час суправаджае дыету, перашкаджае худзець. Дарэчы, часцей менавіта ён, а не голад робіць вас раздражняльным. Адсюль, напэўна, і міф пра тое, што ўсе тоўстыя — добрыя, а худыя — злыя.

Самыя бессэнсоўныя дыеты — з ліку «прыдумаў сам». Адна знаёмая, калі вырашыла прывесці сябе ў форму, прыйшла да высновы, што ёй трэба проста меней есці. Прычым мела яна на ўвазе колькасць не прадуктаў, а прыёмаў ежы. Пакінула сабе толькі сняданак і вячэру. А з улікам таго, што зранку есці ёй не хацелася (яшчэ б — увечары яна не адмаўляла сабе ні ў чым), харчавалася толькі раз на дзень. Зразумела, што выніку ад такой дыеты ніякага.

Нездаровыя адносіны да ежы — гэта не толькі калі «ўпісваеш» усё без разбору. Хвалявацца з-за кожнай лішняй калорыі і набываць толькі абястлушчанае таксама не вельмі добра. Многія прадукты незаслужана аказаліся ў спісе шкодных для фігуры. Тая ж макарона. Адмаўляцца ад яе не прымушаюць нават дыетолагі. Бо не ад макароны паўнеюць, а ад соусаў і шкваркі, з якімі яе падаюць. Хуткія вугляводы ўвогуле лічаць сусветным злом, хоць яны арганізму таксама неабходны, бо дапамагаюць імгненна зарадзіцца энергіяй. Тое, што трэба зранку ці перад вялікай фізічнай нагрузкай.

Ведаеце, у чым сакрэт дзяўчат, якія ядуць што заўгодна і не паўнеюць? Справа не толькі ў добрай генетыцы. Яны проста не «заганяюцца» наконт харчавання. Менш думаеш пра ежу — менш спакусаў сарвацца ў «прамысловых маштабах».

Што цікава, дыета не гарантуе, што вы нарэшце будзеце задаволены сваім целам (а для гэтага ж і худзеюць). У інтэрнэце чытала гісторыю дзяўчыны, якой удалося скінуць 40 (!) кілаграмаў. Яна прызнаецца, што настолькі паглыбілася ў падлік калорый і трэніроўкі, што перастала цікавіцца чымсьці яшчэ: «Самым вялікім расчараваннем стала тое, што калі я дасягнула мэты і нарэшце стала худой па агульных мерках, я не стала шчаслівай. Ні кроплі. Я стала злой, замкнёнай, са мной больш не было пра што размаўляць». Праблемы, як аказалася, не знікаюць разам з лішнімі кілаграмамі.

Ушанавалі памяць загінулых

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ
БРСМ
ЧЫРВОНКА

Валанцёры Брэсцкай гарадской арганізацыі БРСМ прынялі ўдзел у міжнародным форуме ў рамках культурнага абмену паміж моладдзю Беларусі, Польшчы і Германіі, які праходзіў у польскім палацава-паркавым комплексе «Roskosz». На мерапрыемстве наш бок прадстаўлялі студэнты-валанцёры ВНУ, прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі.

Кожная з дэлегацый прадставіла прэзентацыі, у якіх ішла гаворка пра памятныя мясціны сваіх краін, звязаныя з трагічнымі падзеямі Другой сусветнай вайны. Моладзь Беларусі ўразіла ўдзельнікаў форуму сцэнай памяці пра вайну і відэаролікам «Вышыня».



Удзельнікі міжнароднага форуму наведалі Бяла Падляску, Люблін, месцы пахавання савецкіх ваеннапалонных (1944 г.), музей Паўднёвага Падляшша, а таксама вядомы канцэнтрацыйны лагер Майданак. Падчас Другой сусветнай вайны ён быў створаны адным з першых. Плошча лагера складала больш за 37 гектараў. З і 4 лістапада 1943 года на яго тэрыторыі была праведзена аперацыя пад кодавай назвай «Эрнтефест». У яе ходзе эсэсаўцы знішчылі ў лагерах Майданак, Панятова ўсіх яўрэяў з Люблінскага раёна. Па розных ацэнках, было забіта ад 40 да 43 тысяч чалавек. Пазней каля месца расстрэлу савецкія ўлады сабралі ўвесь попел з крэматорыяў і змясцілі ў так званы Маўзалей, у якім захоўваецца больш за 11 тон праху.

Чысціня гарадоў — у руках моладзі

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя падвяло вынікі трэцяга, заключнага этапу рэспубліканскага конкурсу «Моладзь за чысціню гарадоў і вёсак», які праводзіцца штогод сумесна з грамадскім аб'яднаннем «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Да ўдзелу ў трэцім этапе валанцёрскія атрады прадставілі 31 справаздачу аб праведзенай рабоце. Былі вызначаны пераможцы.

У намінацыі «Лепшы валанцёрскі атрад (лагер) сярод вучнёўскай моладзі» пераможцам прызнаны атрад полацкай сярэдняй школы №1. У намінацыі «Лепшы валанцёрскі атрад (лагер) сярод студэнцкай моладзі» першае месца заняў экалагічны атрад «ЭКАС» Полацкага дзяржаўнага ляснога каледжа. У намінацыі «Лепшы валанцёрскі атрад (лагер) сярод працоўнай моладзі» «пальма першынства» — у атрада «Чысцёхі» Скідзельскага гарадскога камітэта «БРСМ». У намінацыі «Лепшая ландшафтная кампазіцыя» першае прызавое месца дасталося атраду Полацкага каледжа УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава». У намінацыі «Лепшы валанцёр атрада (лагера) сярод навучэнцаў, студэнцкай, працоўнай моладзі» п'едэстал гонару занялі: першае месца — Ганна Багдановіч, камандзір валанцёрскага атрада «ЭКАС» Полацкага дзяржаўнага ляснога каледжа; другое месца — Данііл Сакалоў, валанцёр атрада «Праменьчыкі» Дубровенскай сярэдняй школы №1; трэцяе месца — Уладзімір Пракоф'еў, камандзір валанцёрскага атрада «Вясёлка» Арэхаўскай сярэдняй школы Аршанскага раёна.

Пераможцы былі адзначаны дыпломамі і грашовымі прэміямі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 11 2016 г.

Мары — збываюцца!

ВЫНАЙСЦІ... ТАБЛЕТКУ,

або Каму не дае спакою валяр'янка

Углыбіні тэрыторыі Барысаўскага завода медыцынскіх прэпаратаў хаваецца непрыкметны шэры будынак. Нягледзячы на памер і сціплы выгляд, яго значэнне цяжка пераацаніць — работа вялікіх вытворчых цэхаў без гэтага будынка наўрад ці магчымая. Гэта лабараторыя цвёрдых лекавых формаў, дзе займаюцца распрацоўкай новых таблетак і аналагаў дарагіх замежных прэпаратаў. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» пагутарылі з яе супрацоўнікам, маладым інжынерам-тэхнолагам першай катэгорыі Максімам СКОТНІКАВЫМ.

— Працаваць на «Барысаўскі завод медпрэпаратаў» я прыехаў у 2007 годзе, — уводзіць у курс справы тэхнолаг. — Да гэтага вучыўся ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце на спецыяльнасці «Біятэхналогія». У той час яе выпускнікі працавалі ў розных адгалінаваннях прамысловасці: ад харчовай да фармацэўтыкі. Выбраў такую спецыяльнасць, бо ў старшых класах пачаў захапляцца хіміяй, удзельнічаў у алімпіядах па гэтым прадмеце, неаднойчы выходзіў на «вобласць», перамагаў у рэспубліканскім конкурсе юнага эколага. Калі шчыра, нават не думаў, што апынуся тут: сам вырас у Аршанскім раёне, у ваенным гарадку Балбасава. Але калі надышоў час размеркавання, выбраў Барысаў — адправіўся сюды разам з іншымі выпускнікамі.

Максім успамінае, што яшчэ тады бачыў сябе ў якасці навуковага супрацоўніка, які займаецца распрацоўкай новых лекаў. У БДТУ ён пачаў навукова-даследчую працу: займаўся праблемай удасканалення вытворчасці настойкі з валяр'яну, спрабаваў атрымаць большую колькасць актыўных рэчываў пры дапамозе ўльтрагуку, і на будучым месцы працы планаваў працягваць гэты кірунак. Але лёс распарадзіўся інакш: яго накіравалі ў таблетачны цэх, дзе вырабляюць валяр'янку, на пасаду майстра. Зрэшты, гэта таксама дапамагло станаўленню навукоўца, бо ён блізка пазнаёміўся з вытворчым працэсам.

— Не магу сказаць, што тая работа мне не падабалася, — падкрэслівае Максім. — Наадварот, калектыў мяне прыняў, у нас атрымалася выдатная змена, адна з самых маладых. Працаваць сапраўды было цікава. Паралельна сам вырашыў развівацца далей і паступіў вучыцца ў Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ. Атрымаў дыплом па спецыяльнасці «Менеджмент і кіраванне персаналам». Пасля двух гадоў адпрацоўкі папрасіў, каб мяне нарэшце перавялі ў лабараторыю, дзе я знаходжуся і цяпер.

На новым месцы Максім заняўся непасрэдна распрацоўкай новых лекавых формаў. Галоўны кірунак работы — стварэнне так званых джэнерыкаў, прасцей кажучы, танных аналагаў дарагіх замежных прэпаратаў. За сем гадоў Максім распрацаваў каля дзесяці такіх лекавых сродкаў, усе яны прадаюцца ў аптэках: «Рыбаверын», «Німесулід», «Мелаксікам», «Бісапралол», «Рэспірыдон», «Кліндацыл»...

— Нягледзячы на тое, што я актыўна займаўся джэнерыкамі, валяр'янка таксама не выходзіла ў мяне з галавы, — кажа інжынер-тэхнолаг. — Вельмі важна, што ў нас на заводзе вытворчасць гэтага гамеапатычнага прэпарата адбываецца па поўным цыкле. Прывозяць сыравіну — здробнены корань валяр'яну, які вырошчваюць на вопытнай

«Я магу бачыць вынікі сваёй працы — гэта лекі, якія дапамагаюць людзям, Менавіта тут я на сваім месцы».

базе, яго засыпаюць у вялікія ёмістасці (перкалятары), заліваюць спіртаводнай сумессю, настойваюць, выпарваюць і атрымліваюць гатовае рэчыва — экстракт. Праблема была ў тым, што з-за невысокай канцэнтрацыі карыснага рэчыва для дасягнення тэрапеўтычнага эфекту трэба было спажыць адразу вялікую колькасць таблетак. І мы задумаліся над стварэннем новай.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Спачатку на заводзе пайшлі простым шляхам — павялічылі памер таблеткі ў некалькі разоў. Прэпарат атрымаў назву «Валяр'яна Фортэ» і пайшоў у вытворчасць, але пазнейшыя даследаванні паказалі, што нават гэтая канцэнтрацыя таксама недастатковая. Таму Максім працягваў работу і здолеў знайсці рашэнне праблемы. Калі тлумачыць «на пальцах», спецыяліст распрацаваў абсалютна новы састаў таблеткі, а новая тэхналогія дазволіла пазбегнуць непатрэбнага дадатковага раскладання экстракту пры выпарванні. Эфект ад ужывання такога лекавага сродку стаў мацнейшым у разы.

Новая таблетка, якая ўжо паступае ў беларускія аптэкі, атрымала назву «Рэвалон-600». Рыхтуецца да выхаду яна і меншага аб'ёму — «Рэвалон-300». Максім адправіў заяўку на атрыманне Еўразійскага патэнта, які будзе звязаны з гэтай распрацоўкай.

Увогуле, на стварэнне аднаго прэпарата-джэнэрыка, па словах інжынера-тэхнолага, патрабуецца каля пяці гадоў. Падчас распрацоўкі робяцца прататыпы таблетак, якія праходзяць шматлікія выпрабаванні і даследаванні. Іх правяраюць па разнастайных паказчыках якасці і, самае галоўнае, усё гэта параўноўваецца з арыгіналам. Нават калі ўсё супадае, гэта далёка не канец. Далей — тэарэтычная і практычная экспертызы. Апошняя стадыя — клінічныя выпрабаванні. Калі няма сур'ёзных пабочных эфектаў і іншых праблем, завод атрымлівае дазвол на выпуск прэпарата.

— Зрабіць таблетку — цэлае мастацтва, — дзеліцца спецыяліст. — Ты спрабуеш розныя камбінацыі дзеючых і дапаможных рэчываў, пакуль не атрымаецца поўны аналаг арыгінала, які будзе каштаваць у разы танней.

Вядома, для такіх сур'ёзных задач патрэбная не менш сур'ёзная тэхніка. Максім праводзіць нам невялікую экскурсію па памяшканнях. Чаго тут толькі няма: ад прэсаў, на якіх фармуюцца таблеткі, да ўстановак, дзе можна адразу праналізаваць атрыманае.

Яшчэ ва ўніверсітэце Максім удзельнічаў у рабоце народнага студэнцкага паэтычнага тэатра «Звон», які існуе і сёння. Атрымаў там спецыяльнасць «кіраўнік тэатра малых формаў і арганізатар культмасавай работы». Нядзіўна, што і сёння хлопец з'яўляецца вядучым завадскога КВЗ, шматлікіх конкурсаў і фестываляў.

— Чаму мне падабаецца работа ў вытворча-тэхнічнай лабараторыі? — перапытвае інжынер-тэхнолаг. — Я магу бачыць вынікі сваёй працы — гэта лекі, якія дапамагаюць людзям. Менавіта тут я на сваім месцы.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by
Мінск — Барысаў — Мінск.

Кветкі ад Гошы

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А як вы трапілі ў цырк?

— Аднойчы мяне запрасілі туды знаёмыя. Спачатку думала, што паклікалі проста паглядзець выступленне, але мяне правялі не ў залу, а адчынілі дзверы нейкага пакоя і проста запіхнулі ўнутр са словамі «Вось яна!» Стаю разгубленая, бачу, за сталом два дзядзечкі гарбату п'юць, на вешалцы — касцюмы для выступленняў. Я тады пачала сітуацыю выпраўляць: пацікавілася, ці патрэбныя коні, чым магу паспрыяць — так пазнаёмілася з Барысам Лазаравым, кіраўніком нумара «Джыгіты», дапамагла яму знайсці маладых коней, потым разам рыхтавалі жывёл да выступленняў, пакуль трупа не з'ехала на гастролі. Другі раз сустрэліся, калі была ў дэкрэтным адпачынку. Лазараў патэлефанаваў і прапанаваў заходзіць. Праз нейкі час я ўжо была служачай, потым займела свайго каня, пачала ставіць нумары. І ўжо 12 гадоў як працую ў цырку.

— Памятаеце, як упершыню сустрэліся са сваімі гадаванцамі?

«Складанасцяў з занадта разумнай жывёлай хапае. На выступленні ніколі не здагадаешся, калі конь будзе выконваць нумар, а калі пачне імправізаваць».

— Поні Масяню забрала яшчэ жарабём з племянной гаспадаркі з-пад Мінска. Прасіла ў загадчыка: «Дайце самага маленькага поні, які ў вас ёсць у табуне». Цяпер Масяні чатыры гады, і сёлета ён упершыню выступае ў праграме. У першы тыдзень страшэнна хваляваўся і выскоквай за кулісы з напалоханымі вачыма — мноства людзей, новыя пахі, гукі, асаблівая энергетыка ў зале... Але цяпер паступова прывыкае да ўвагі і апладысментаў. Другому каню, Гошу, ужо трынаццаць гадоў. Былая гаспадыня прывезла яго з Расіі, дзе выратавала ад продажу на мясакамбінат. Праз нейкі час выявілася, што Гоша надзвычай разумны, ён мог адчыняць любыя запоры і сыходзіць у стойлы да суседзяў. Гаспадыні такія візіты надакучылі, і яна аддала каня ў коннаспартыўную школу, а там яго ўжо прапанавалі мне. Конь аказаўся сапраўды кемлівым, працаваць з ім надзвычай цікава. Хоць і складанасцяў з занадта разумнай жывёлай хапае. На выступленні ніколі не здагадаешся, калі конь будзе выконваць нумар, а калі пачне імправізаваць. У нас у праграме ёсць момант, калі Гоша павінен прынесці мне букет кветак. Дык ён можа кветкі ўзяць і пайсці дражніцца ў залу. Працягвае чалавеку «падарунак» цераз бар'ер, той збіраецца забраць, а Гоша ўжо адхіліўся і іншаму гледачу прапануе. І нікому не аддае.

— Колькі часу ў сярэднім рыхтуецца нумар?

— Ад першага трука на манежы да таго моманту, калі жывёла перад гледачамі зможа стабільна адпрацоўваць нумар, могуць прайсці гады. Усё адбываецца па-рознаму. Часам нейкі элемент не атрымліваецца месяцамі, напрыклад, у мяне быў конь, з якім мы болей за год трэніравалі паклон. А аднойчы ён проста ўзяў і пакланіўся.

— Якім чынам можна прымусіць жывёлу зрабіць нешта ёй неўласцівае, напрыклад, для каня — сесці на заднія ногі?

— Ні ў адной краіне няма спецыяльнай школы для дрэсіроўшчыкаў, нейкі вопыт работы з коньмі ў мяне застаўся з коннаспартыўнай школы, нешта вынесла з работы на конезаводзе, потым назірала, як працуюць іншыя дрэсіроўшчыкі. Часам даводзіцца чуць меркаванне, што ў цырку здзекуюцца са звяроў. Я не сцвярджаю, што ўсе людзі абыходзяцца з жывёламі адэкватна, але такія, як правіла, у цырку не затрымліваюцца. Я стараюся заахвоціць гадаванцаў, падкормліваю іх яблыкамі, сухарыкамі, сушкамі, цукрам. Калі ў Беларусь прыехаў румынскі дрэсіроўшчык Штэфан Плешаяну, ён вырашыў мне дапамагчы з разнастайнасцю нумара, падчас рэпетыцыі падышоў і прапанаваў: «А давай мы каня навучым ляжаць? Жывёла, бачна, разумная, за дзесяць рэпетыцый асвоіць». Склікалі брыгаду служачых і агульнымі намаганнямі паклалі Гошу. Праз пяць рэпетыцый

Фота Надзеі БУЖАН.

конь спакусіўся пачастункам і лёг сам. Штэфан на гэтым не спыніўся і прапанаваў навучыць Гошу садзіцца, прыносіць рэчы. А потым асобныя кавалачкі абраслі ідэяй і з'явіўся нумар «Каўбоі», які цяпер ідзе ў праграме «Трыумфатары арэны».

— Вы вучыце коней трукам, складаеце нумар, падбіраеце музыку. Пра што яшчэ трэба паклапаціцца перад тым, як выйсці да гледачоў?

— Павінна быць пэўная артыстычная падрыхтоўка. Акрамя таго, на манежы дрэсіроўшчык пастаянна кантралюе свой настрой. Неабходна заставацца сабраным, спакойным, бо гадаванец заўсёды арыентуецца на цябе. Часам жывёла выходзіць на манеж у дрэнным настроі, і ёй не растлумачыш, што гэта работа. Таму стараешся настроіць гадаванца яшчэ за кулісамі. Калі конь занадта радасны — адпраўляеш пабегаць, пакуль не супакоіцца, калі сумны, дазваляеш колькі хвілін падурэць, каб да гледачоў выйшаў гатовы працаваць.

— Ці бываюць у жывёл і дрэсіроўшчыкаў канікулы?

— Калі ў праграме няма нумароў, то часам дазваляем сабе адпачыць тыдзень ад трукаў. Коням без руху нельга, таму яны проста бегаюць, дурэюць. Калі ёсць магчымасць, можам выехаць за горад. Падчас рамонту ў цырку нас часова размясцілі ў шапіто каля станцыі метро «Усход». Там можна было кожны ранак выязджаць у лес, слухаць птушак і «пужаць» спартсменаў, якія бегалі па сцежках.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
yurgel@zviazda.by

Свая гульня

«МАЛЕНЬКІ» ТЭНІС ПАТРАБУЕ ВЯЛІКАЙ ПРАЦЫ

Дамовіцца наконт інтэрв'ю з членам нацыянальнай каманды Беларусі па настольным тэнісе Аляксандрам ХАНІНЫМ было няпроста. Кожны дзень васямнаццацігадовага спартсмена распісаны па хвілінах, дома ў Мінску ён бывае даволі рэдка. Але пасля заканчэння 9-га Адкрытага чэмпіянату Беларусі па настольным тэнісе, дзе яны ўзялі «бронзу», у Сашы з'явілася вольная гадзіна для інтэрв'ю.

— Раскажы, калі ласка, чаму ты абраў менавіта гэты від спорту?

— Першапачаткова я хацеў займацца вялікім тэнісам. Але выбраў настольны па парадзе Міхаіла Васковіча, які з'яўляецца суддзёй на большасці сур'ёзных спаборніцтваў па гэтым відзе спорту ў Беларусі. Менавіта ён паўплываў на мой выбар.

— Ёсць меркаванне, што для таго, каб дасягнуць поспеху ў якой-небудзь справе, неабходна займацца ёй на працягу дзесяці тысяч гадзін. А колькі ты займаешся настольным тэнісам?

— Дакладна больш за гэты паказчык. Я займаюся настольным тэнісам з шасці гадоў. Першы год проста трэніраваўся тры разы на тыдзень у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па настольным тэнісе. Пасля пачаліся спаборніцтвы (гарадскія, рэгіянальныя), на якіх я звычайна ўваходзіў у тройку пераможцаў. Мой першы трэнер — Аляксандра Сіпач — гэта заўважыла, і тады трэніроўкі сталі штодзённымі. Калі мне было дзесяць, трэнерам стаў Андрэй Вараб'ёў, з таго часу я перастаў трэніравацца з равеснікамі. Гадоў з трынаццаці займаюся тэнісам двойчы ў дзень — раніцай і ўвечары.

— А дзяцінства ў цябе было?

— Канешне! Проста яно атрымалася больш насычаным, чым у астатніх. Да восьмага класа я вучыўся ў звычайнай гімназіі, у мяне ніколі не было «васьмёрак» за чвэрць — толькі «9» і «10». Мае бацькі добра вучыліся, брат быў выдатнікам, было на каго раўняцца. І ўсё ж у пэўны момант прыйшлося выбіраць паміж тэнісам і вучобай. У Рэспубліканскім вучылішчы алімпійскага рэзерву, якое я скончыў з залатым медалём, для кожнага навучэнца складаецца індывідуальны план. Ён дазваляе не прапускаць заняткі.

— Напэўна, ёсць спартсмены, на якіх ты раўняешся...

— Канешне! Гэта беларускі тэнісіст Уладзімір Самсонаў. Цяпер мы члены адной каманды, мне даводзілася выступаць разам з ім, я натхняюся яго талентам і спрабую пераняць нешта.

— Ці бываюць моманты, калі табе хочацца ўсё кінуць і жыць, як звычайныя хлопцы твайго ўзросту?

— Бывае, інтарэс да тэніса знікае, калі доўга не выйграеш на спаборніцтвах. Тады хаджу на трэніроўкі як на аўтапілоце, без асаблівай радасці і задавальнення. Дарэчы, у нашай каманды ёсць псіхолаг. Я час ад часу да яго звяртаюся.

Але думак пра тое, каб кінуць, не бывае ніколі. Тэніс — не проста частка майго жыцця, гэта ўжо і работа. Тут неабходна патлумачыць, што ў мяне бывае толькі адзін выхадны на тыдзень, і то калі пашчасціць! У такія дні я звычайна нешта вучу, стараюся праводзіць час з бацькамі, якія рэдка мяне бачаць.

— Цікава, як у цябе складваюцца адносіны з дзяўчатамі, калі нават на адпачынак часу не хапае. Ды і ўвогуле, сябры ёсць?

— Сяброў шмат: і сярод тых, з кім трэніруюся, і з былымі гімназістамі сувязь падтрымліваю. Праўда, бачуся з імі вельмі рэдка. Што да дзяўчат, дык выратоўваюць сацыяльныя сеткі. Праз іх знаёмлюся і перапісваюся.

— Настольны тэніс не вельмі папулярны від спорту ў Беларусі, калі параўноўваць яго з хакеем, вялікім тэнісам ці біятлонам. На тваю думку, магчыма гэта выправіць?

— Сапраўды, настольны тэніс у нас успрымаюць больш як аматарскую гульню, а не алімпійскі від спорту. Але дакладна ведаю, што «маленькі» тэніс патрабуе не менш сіл, чым вялікі. У суседняй Польшчы існуюць тэнісныя клубы, за адзін з якіх я гуляю. Там паглядзець на спаборніцтвы прыходзяць не толькі блізкія і сябры тэнісістаў, як у нас, але і фанаты, і проста гледачы.

Не так даўно сусветна вядомы брэнд тэніснай экіпіроўкі падпісаў кантракты з некалькімі беларускімі спартсменамі, у тым ліку са мной. У той жа Еўропе гэта даўно практыкуецца, а для беларускіх тэнісістаў — новы ўзровень.

Думаю, цікавасць да настольнага тэніса з'явіцца ў жыхароў нашай краіны тады, калі нацыянальная каманда будзе добра выступаць не толькі на еўрапейскіх спаборніцтвах, але і на сусветных. Гэта, дарэчы, добрая матывацыя для будучых перамог!

Ганна КУРАК,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Падтрымка з пампонамі

«ЗА ЛІШНЮЮ ВАГУ НЕ ВЫГАНЯЕМ»

Каго бяруць у чырлідары?

Некалі выступленні чырлідараў можна было пабачыць толькі ў амерыканскіх фільмах. Сёння дзяўчаты з пампонамі ўпрыгожваюць ледзь не кожны буйны матч і не даюць гледачам засумаваць у перапынку. Які адбор праходзяць тыя, хто хоча трапіць у каманду? Наколькі гэта дарагі від спорту? І чаму ў групах падтрымкі не відаць хлопцаў? Пра гэта гутарым з кіраўнікамі студыі чырлідынгу Chilly girls, выпускнікамі БДПУ Надзеяй і Віталём ПРАЗАРОВІЧАМІ.

Надзея: — У нас чырлідынг стаў развівацца недзе з 2005 года. Конкурс паміж школьнымі камандамі прапанавала праводзіць Міністэрства адукацыі. Я на той момант працавала ў цэнтры творчасці дзяцей і моладзі Першамайскага раёна сталіцы, вяла гурток аэробікі. Новы напрамак зацікавіў. Мы паглядзелі па касетах, што такое чырлідынг, паспрабавалі зрабіць харэаграфічны нумар з пампонамі.

Удала выступілі, некалькі гадоў займалі прызавыя месцы. Потым у чырлідынг сталі падцягвацца спартсмены, акрабаты. І танец з пампонамі пачаў ператварацца ў нумар з эфектнымі акрабатычнымі элементамі. Цяпер у Беларусі ёсць федэрацыя чырлідынгу і каманд падтрымкі. З мінулага года яна актыўна супрацоўнічае з Міністэрствам адукацыі, каб папулярызаваць гэты кірунак у школах.

— Чырлідынг — дарагі від спорту?

Віталь: — Таннейшы, вядома, чым хакей ці вялікі тэніс. Калі ты працуеш «на конкурсы», трэба аплачваць гадавы ўзнос у федэрацыю — гэта каля 20 рублёў плюс удзел у спаборніцтвах — ад 10—15 рублёў за танец з чалавека. Касцюм можа каштаваць ад 30 рублёў і да бясконцасці. Трэніроўкі таксама платныя. Думаю, рублёў 500—600 у год ідзе на гэту справу. Прычым без паездак на спаборніцтвы за мяжу.

— Дзяўчаты праходзяць строгі адбор?

Надзея: — Калі іх наймаюць на работу, так. Ты павінна паказаць пэўныя харэаграфічныя і гімнастычныя навыкі, умець працаваць у камандзе. Адбор сур'ёзны, бо на гадавы кантракт бяруць звычайна 6—8 чалавек.

Віталь: — Чырлідынг такая ж праца, як і ўсе астатнія. Трэба шмат займацца. У нас былі выпадкі, калі дзяўчаты хацелі хадзіць толькі на выступленні. Але так не атрымліваецца. Яны адстаюць ад праграмы, падрыхтоўка пакрысе пагаршаецца.

— Чырлідаркі выступаюць у даволі адкрытых касцюмах. Ад іх патрабуюць сядзець на дыетах?

Надзея: — Ёсць пажаданне прытрымлівацца правільнага харчавання. Зразумела, што калі ў цябе зашмат лішняй вагі, ты проста не зможаш танцаваць. І не надзенеш адкрытую сукенку. Калі робіш кола ці батман, сцёгны агаляюцца, відаць усе заганы фігуры. Таму трэба мець або ідэальныя ногі, або набор калготак у сетачку *(смяецца)*.

— За лішнюю вагу могуць выгнаць з каманды?

Надзея: — Дзяўчаты «ў целе» могуць выступаць, але будуць стаяць у апошняй лініі, дзе іх проста не відаць. Але пышкі патрэбны для пірамід і іншых складаных элементаў. Немагчыма худзенькім чырлідаркам падымаць дзяўчат на ўзровень грудзі ці выводзіць на выцягнутыя рукі. Гэта мужчынская работа.

— Дарэчы, чаму не відаць хлопцаў у чырлідынгу?

Надзея: — Яны ёсць — у камандах, якія выступаюць на спаборніцтвах. І ў намінацыі Cheer, дзе паказваюць складаныя акрабатычныя элементы, цяпер практычна няма жаночых каманд. А на матчы часцей запрашаюць проста прыгожых дзяўчат з пампонамі.

Віталь: — Чырлідынгам складана зарабляць. Калі няма грошай — не будзе і хлопцаў. Як і ўсюды. Хоць пачынаўся чырлідынг з хлопцаў. І пампоны таксама прыдумалі мужчыны.

— А што наконт касцюмаў, тут прасочваецца нейкая мода?

Надзея: — Раней была тэндэнцыя — асобна майка і спадніца, абавязкова голы жывот. Цяпер жывот хаваюць. Спадніцы ў складку былі модныя пару сезонаў таму, цяпер — прамыя, у якіх перад крыху карацейшы за зад. Прычоскі кожны год мяняюцца. У Амерыцы цяпер папулярна прыбіраць валасы назад і моцна начэсваць хвост. Але мы з дзяўчатамі як ні стараліся, спецыяльныя парашкі нават купілі, усё роўна ідэальна не атрымліваецца. На такую прычоску патрэбна вельмі шмат часу.

— Чытала, што за мяжой забаронены раманы паміж чырлідаркамі і гульцамі клуба...

Віталь: — Калі мы кажам пра прафесійныя каманды, ёсць патрабаванне, каб адносіны не перашкаджалі рабоце.

Надзея: — Бываюць забароны на раманы паміж чырлідарамі. Адна дзяўчына расказвала, што яе хлопца ўзялі ў асноўны састаў, а яе не, бо нельга, каб пара выступала разам.

Віталь: — Але ў нашай камандзе забароны няма. Калі шчыра, мы б парадаваліся, калі б былі блізкія адносіны паміж нашымі дзяўчатамі і «Ліцвінамі» (каманда па амерыканскім футболе, якую падтрымліваюць Chilly girls. **— Аўт.)**, каб ім было цікавей на гульні хадзіць.

«Калі робіш кола ці батман, сцёгны агаляюцца, відаць усе заганы фігуры. Таму трэба мець або ідэальныя ногі, або набор калготак у сетачку».

— Які сярэдні ўзрост чырлідараў?

Надзея: — На спаборніцтвы ездзяць у асноўным з 14 да 22 гадоў. У групы падтрымкі пры спартыўных клубах прыходзяць дзяўчаты больш дарослыя, пасля ўніверсітэта, і тут выступаць можна да таго моманту, пакуль ты цудоўна выглядаеш. У нас у камандзе разбежка ад 17 да 31 года. А затрымліваюцца па-рознаму ў залежнасці ад таго, колькі табе хопіць сіл і патрэбы быць на віду. У сярэднім гадоў на пяць прыходзяць.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 11 2016 г.

Друкуецца ў «Маладосці»

Урокі, што мы выносім з дзяцінства

«Маладосць» друкуе на сваіх старонках чатыры гісторыйкі Лады Алейнік, а чытачам «Чырвонкі» прапануе дзве? Несправядліва, скажаце? Ды не, проста «Маладосць» таксама чакае «чырвонкаўскага» чытача.

Цяжка быць Богам

Прыгадваючы свае школьныя гады, заўжды са шкадаваннем успамінаю гэтага хлопца. Са шкадаваннем і з дамешкам сораму, прыкрай няёмкасці.

Ці не ў кожным класе былі такія вучні... Самотныя ізгоі, якіх не прымалі ні ў адну кампанію, з якімі ніхто не сябраваў. У лепшым выпадку іх не заўважалі, у горшым — яны рабіліся ахвярамі дзіцячай кампаніі — з іх кпілі і здзекаваліся, іх бясконца прыніжалі і абражалі.

Вось такой ахвярай быў у нашым класе гэты хлопец. Не, такой жорсткасці, якую сёння можна ўбачыць у сеціве — калі падлеткі натоўпам топчуць нагамі аднагодка і здымаюць гэта на мабільнікі, — у нас не было. Было іншае...

Мы вучыліся разам усяго два гады. Пасля восьмага класа, калі частка вучняў паступіла ў тэхнікумы ды вучылішчы, астатніх «аб'ядналі» — з пяці восьмых класаў утварылі два дзявятыя. Вось так мы сталі з ім аднакласнікамі.

Хлопец гэты быў... вялізны. Вельмі высокі і вельмі тоўсты, рыхлы і няўклюдны. І страшна неахайны. Не прыгадаю, каб хоць раз бачыла яго з чыстай галавой. Валасы ў яго заўсёды былі тлустыя і зліплыя. Твар вуграваты. Школьны касцюм — пакамечаны і заплямлены. Ад яго патыхала потам і нейкімі лекамі — ці то валяр'янкай, ці то карвалолам. Апроч таго, у яго былі акуляры з тоўстымі лінзамі, якія рабілі вочы маленькімі, а ўвесь твар камічным.

За адну парту з ім ніхто не садзіўся. Ім адкрыта грэбавалі. Зневажыць яго не лічылася чымсьці выключным, гэта было натуральна, як чхнуць. Яго ніхто не называў па імені, да яго звярталіся толькі па мянушцы — Сала.

У яго не было сяброў ні ў школе, ні па-за школай. На вуліцы яго можна было ўбачыць толькі ў кампаніі маці — неверагодна тоўстай жанчыны ў дзіўнай вопратцы. Яна заўжды была апранута ў нейкія старасвецкія ўборы — шырокія і даўжэзныя спадніцы, кофтачкі з процьмай брыжыкаў ды карункаў, ідыёцкія капялюшыкі. Сын і маці былі вельмі падобныя — абое вялізныя, няўклюдныя... і агідныя.

Вучыўся ён добра. Асаблівыя здольнасці выяўляў у матэматыцы ды фізіцы. Гэтым карысталіся. У яго ледзь не штодня адбіралі партфель, выцягвалі сшыткі з хатнімі заданнямі і дружна спісвалі. А пасля шпурлялі сшыткі яму ў твар і пагражалі: «Ну, глядзі, Сала! Калі будуць памылкі, капец табе!»

Але найбольшыя прыніжэнні ён перажыў у дзясятым класе, калі закахаўся ў аднакласніцу. Не ведаю, што яго ў ёй прывабіла. Бо не была яна ні прыгожай, ні разумнай... Ці не самая разбэшчаная ў нашым класе, вучылася праз пень-калоду.

Ён не ўмеў хаваць пачуцці, у яго ўсё было на твары. На ўроках вачэй з яе не зводзіў — нават за тоўстымі лінзамі было відно, якой пяшчотай поўняцца яго вочы.

А дзяўчына гэтая ўспрыняла яго ўвагу як абразу. Яна проста ўзненавідзела яго! (Тым больш што з яе пачалі пацвельвацца аднакласнікі — маўляў, вось які ў цябе класны кавалер! Пашанцавала дык пашанцавала!) Праходзячы каля яго парты, яна магла плюнуць яму ў сшытак. Бруднай анучкай, якой мыюць дошку, магла пляснуць яму па твары і задаволена зарагатаць пры гэтым на ўвесь клас. А ён ніяк не рэагаваў — чырванеў і маўчаў.

Дасюль не магу дараваць сабе, што я тады яго не абараніла. А магла гэта зрабіць. Не, я не была супер-пупер аўтарытэтам у класе. Відавочнага лідара ў нас увогуле не было. Проста з маім меркаваннем лічыліся. І я дакладна ведаю, што калі б загадала пакінуць гэтага хлопца ў спакоі, ад яго адчапіліся б. Толькі вось тады мне не было яго шкада. Зусім. Ні кроплі. Ён не выклікаў у мяне ніякага спачування, адно агіду ды грэблівасць. Мне, як і ўсім, было смешна, калі ў сталоўцы нехта пацэліць катлетай у яго міску з баршчом. Смешна было глядзець, як ён абцірае рукавом запырсканы твар...

Дзіўна, але пасля заканчэння школы — на працягу дваццаці пяці гадоў! — мы з ім ніводнага разу не перасякліся. Хоць яго дом стаіць на адлегласці каля сотні метраў ад майго, і паўз гэты дом я кожны дзень праходжу па некалькі разоў.

З той аднакласніцай, у якую ён быў закаханы, нашы шляхі таксама разышліся адразу пасля школы. Праўда, яе мне даводзіцца бачыць амаль штодня — у кампаніі спітых мужыкоў ля крамы. Часам яна спыняе мяне і жаласліва просіць грошай — заўсёды адна і тая ж песня: «Выручы... вельмі трэба... я ж аддам...»

Вось гэтым летам, працуючы ў прыёмнай камісіі, я такі сустрэла таго хлопца. Мы сутыкнуліся каля выхада з універсітэцкага рэктарата. Ён галантна адчыніў перада мной дзверы, глянуў у твар і... пазнаў. І так радасна павітаўся, быццам убачыў дарагога сябра!

Выйшлі з будынка і прыпыніліся пагутарыць. Ён расказаў, што даўным-даўно жыве ў іншым раёне горада, да маці прыязджае рэдка. Часцей яна ездзіць да яго — дапамагае даглядаць дзяцей. Іх у яго двое — сын і дачка. Працуе ён ва ўніверсітэце. У мінулым годзе абараніў доктарскую.

Нельга сказаць, што знешне ён моцна змяніўся. Такі ж высозны і тоўсты. Толькі цяпер ён выглядаў не няўклюдна, як у падлеткавыя гады, а прадстаўніча ды імпазантна. Увесь з сябе рэспектабельны, дагледжаны. Тыя жудасныя акуляры змяніў на кантактныя лінзы. Патыхаў дарагой парфумай. Пахваліўся дарагім аўтамабілем.

Мне страшна хацелася папрасіць у яго прабачэння за ўсё, што калісьці адбывалася ў школе. Але размова ў нас была такая лёгкая і прыязная, што няёмка было нават згадваць пра колішнія падзеі. Магчыма, я проста сапсавала б яму настрой напамінам пра былое. Бо каму прыемна такое ўспамінаць?

А пасля ён пацікавіўся, ці не ведаю я, як пажывае тая дзяўчына — тая, у якую ён быў закаханы ў дзясятым класе і якая так люта помсціла яму за гэта. І я схлусіла. Сказала, што сто год яе не бачыла і нічога пра яе не ведаю. А што я павінна была яму сказаць? Што яна ўшчэнт спілася? Што ходзіць брудная і пабітая? Было ж бачна, што нават праз дваццаць шэсць гадоў пасля школы, пасля ўсіх прыніжэнняў, якія стрываў ад той дзяўчыны, ён захаваў да яе нейкія рэшткі пачуццяў. Вось няхай і далей захоўвае. Магчыма, ён марыць сустрэць яе калі-небудзь. Марыць, што яна ўбачыць, якім ён стаў, і моцна-моцна пашкадуе, што тады адпрэчыла яго.

Пасля той сустрэчы я доўга думала пра гэтых дваіх. Фантазіравала, як маглі б скласціся іх лёсы, калі б, напрыклад, усё пайшло па-іншаму... Уяўляла розныя варыянты разгортвання жыццёвых сюжэтаў.

Разумею, якая няпростая праца ў Таго, хто назірае за намі зверху. Столькі лёсаў у Яго руках! І пра кожны лёс трэба паклапаціцца асобна. Відавочна, што шанец Ён дае кожнаму. Ну, а ўжо як распарадзіцца гэтым шанцам — наша асабістая справа.

Пра адну дзяўчынку

Дзяўчынцы было адзінаццаць гадоў. І аднойчы хлопчык-аднакласнік запрасіў яе на дзень нараджэння. У яго тады сабралася даволі вялікая кампанія, недзе пятнаццаць дзяцей. Святкаванне праходзіла традыцыйна. Спачатку — пачостка, прысмакі, торт са свечкамі, пасля — гульні...

У кватэры хлопчыка мелася шмат цікавых рэчаў «марской тэматыкі» — ракавіны, каралы, засушаныя экзатычныя рыбіны. А каля люстра ў калідоры быў прымацаваны дэкаратыўны штурвал, на якім віселі матчыны ўпрыгожванні — рознакаляровыя пацеркі ды ланцужкі... Адзін ланцужок быў з адмысловым кулонам. Хлопчык сказаў, што кулону — бурштынавай кроплі з замураваным усярэдзіне павучком — больш за тысячу гадоў.

Дзяўчынка зняла ланцужок, разгледзела, на сябе прыкінула, каля люстра пакруцілася... Дый вярнула на ранейшае месца.

А на наступны дзень маці гэтага хлопчыка прыйшла ў школу і абвінаваціла дзяўчынку ў крадзяжы. Спачатку выклікала яе ў калідор і сказала, што калі тая верне ланцужок, то яна нікому пра гэты выпадак не раскажа. Дзяўчынка патлумачыла, што нічога не брала. Тады маці хлопчыка пагаварыла з настаўніцай, і дзве дарослыя жанчыны пачалі ўшчуваць і палохаць школьніцу разам... Пасля настаўніца завяла дзяўчынку ў клас, загадала стаць каля дошкі і звярнулася да ўсіх вучняў — маўляў, на дні нараджэння вашага сябра здарылася злачынства... калі хтосьці ведае пра гэта што-небудзь ці нешта бачыў, няхай шчыра раскажа... бо бацькі хлопчыка выклічуць міліцыю, і ўсё будзе высветлена так ці інакш...

Ніхто не разумеў, пра што ідзе гаворка. І дзеці пачалі прыгадваць усе злачынствы дзяўчынкі, пра якія ведалі.

Лепшая сяброўка дзяўчынкі, з якой яны сядзелі за адной партай, паднялася і сказала:

— Яна з Сярожам цалавалася!

Сярожа пачырванеў і крыкнуў:

— Мы не цалаваліся! Яна мне парушынку з вока...

Дагаварыць ён не змог, бо клас выбухнуў рогатам.

А другая аднакласніца гучна абвясціла:

— Яна ўжо ліфчык носіць!

Усе ізноў зарагаталі...

Гэта працягвалася хвілін пятнаццаць. Амаль што вечнасць. Абвінавачанні сыпаліся, як з мяшка гарох... Згадана было ўсё: у каго дзяўчынка аднойчы спісала хатняе заданне, у каго была закахана, што пра каго гаварыла.

Пасля ўрокаў настаўніца прыйшла да дзяўчынкі дамоў і паведаміла яе бацькам, што іх дачка ўкрала залатое ўпрыгожанне і цяпер «трэба думаць, як выходзіць з сітуацыі». Дзяўчынка горка плакала і клялася, што нічога не брала...

На наступны дзень яна не пайшла ў школу. Паўдня блукала па горадзе і думала, як памерці — каб хутка і не балюча. Але не прыдумала. А дома яе чакаў чарговы скандал — настаўніца пазваніла бацькам, і прагул быў выкрыты па гарачых слядах, даруйце за каламбур.

Вечарам таго дня маці дала дзяўчынцы некалькі буйных грашовых купюр і загадала занесці бацькам аднакласніка. Дзяўчынка ізноў плакала і прасіла-маліла, каб яе не прымушалі гэтага рабіць, бо яна ж нічога не крала, а занесці грошы — гэта значыць прызнаць сваю віну. Але бацькі былі няўмольнымі... І яна пайшла, стараючыся ні пра што не думаць. А калі пазваніла ў дзверы і працягнула маці аднакласніка грошы, тая збянтэжылася і замітусілася. Запрасіла дзяўчынку ў кватэру, пачала войкаць ды выбачацца... Урэшце патлумачыла, што ланцужок ужо знайшоўся.

Хлопчык, на дні нараджэння якога ўсё адбылося, пазней прызнаўся дзяўчынцы, што ланцужок сапраўды быў украдзены іх аднакласніцай (нават імя злачынцы назваў). Напалохаўшыся магічнага слова «міліцыя», тая адзінаццацігадовая школьніца ва ўсім прызналася і вярнула рэч гаспадыні. А несправядліва абвінавачаная дзяўчынка была рэабілітавана — настаўніца перад усім класам папрасіла ў яе прабачэння.

Але, нягледзячы на тое, што ўсё высветлілася, дзяўчынцы яшчэ доўга чамусьці было сорамна. Невядома чаму. Пазней яна знайшла адказ у кнізе аднаго пісьменніка. «Мы адчуваем сорам не таму, што ў чымсьці вінаваты, а таму, што наша прыніжэнне бачаць усе».

У цэлым жа гэта гісторыя амаль не паўплывала на далейшы лёс дзяўчынкі. У яе душы не засталося незагойнай раны, яна не ачарсцвела, не расчаравалася ў людзях і нават не зрабіла ніякіх мудрых высноў. Бо якія там высновы ў адзінаццаць гадоў?

...Дзяўчынка даўно вырасла і стала жанчынай. Яшчэ сто разоў у жыцці яна сутыкалася з крыўднымі абвінавачаннямі. Але прынізіць яе мацней, чым яна была прыніжана тады, у пятым класе, нельга. Гэта проста немагчыма. Нават не старайцеся.

Прыемнае з карысным

ПА ЎРАЖАННІ І... БОРШЧ,

або Культурна-кулінарнае падарожжа

Ідэя вандроўкі па Украіне з'явілася ў нас з сябрамі даўно. Для беларусаў гэта адзін з самых танных і, напэўна, цікавых варыянтаў: візы не трэба, ведання замежных моў — таксама. Мы вырашылі ахапіць адной паездкай максімум: сталічны Кіеў, марскую Адэсу і гістарычны Львоў. А пасля вяртання дзелімся сваімі ўражаннямі і практычнымі парадамі з чытачамі «Чырвонкі. Чырвонай змены».

Першае, аб чым трэба загадзя паклапаціцца любому «дзікаму» турысту, — месца жыхарства. Самым танным варыянтам будуць хостэлы. Пакой для траіх на дзве ночы ў Кіеве мы знялі прыкладна за 25 рублёў з чалавека, чатыры ночы ў аналагічным па фармаце пакоі ў Адэсе абышліся кожнаму ў 40 рублёў. Сумарна за начлег у двух гарадах заплацілі 65 рублёў — нават у самых танных гасцініцах за гэтыя грошы можна было б спыніцца толькі на суткі.

Наступнае пытанне — транспарт. Найбольш танны спосаб дабрацца да сталіцы Украіны — аўтобус. Квіткі на рэйсы «Мінсктранса» каштуюць 30 рублёў, трохі даражэй бяруць прыватныя перавозчыкі. Мы скарысталіся паслугамі апошніх і заплацілі 38 рублёў.

У адкрыцці Львоўскага опернага тэатра ў 1900 годзе прымаў удзел славуты польскі пісьменнік беларускага паходжання Генрык Сянкевіч.

Кіеў — горад вельмі цікавы для беларусаў. Тут нямала звязанага з нашай краінай. Нават пакідаючы за дужкамі відавочную тапаніміку (ёсць Беларуская вуліца, станцыя метро «Мінская»), месцаў, якія нагадваюць пра Бацькаўшчыну, хапае. У былым мястэчку Прадславіна (цяпер гэта амаль цэнтр горада) некалі жыла беларуская князёўна Рагнеда, якую сілай забраў са спаленага Полацка князь Уладзімір. Пасля ў Кіеве некалькі месяцаў княжыў яшчэ адзін палачанін — Усяслаў Чарадзей. А ў Кіева-Пячэрскай лаўры больш як сем стагоддзяў захоўваліся мошчы святой Ефрасінні Полацкай. Ужо ў мінулым стагоддзі горад даў прытулак юнаму Уладзіміру Караткевічу (некалькі месяцаў у 1944 годзе ён знаходзіўся тут у сваякоў, а пасля прыехаў на вучобу). Цяпер за тры хвіліны хады ад двара, дзе жыў будучы класік, побач з будынкам беларускага пасольства яму ўсталяваны помнік.

Самы просты спосаб дабрацца з Кіева да Адэсы — цягнік. Можна выбраць фірменны «Чарнаморац», купэ ў якім абыдзецца прыкладна ў 40 рублёў, а можна крыху сэканоміць — квіток на звычайны рэйс каштуе каля 30 рублёў (дарэчы, чыгуначныя перавозкі — адна з рэдкіх паслуг, якія ва Украіне каштуюць даражэй, чым у нас). Мы выбралі апошні: начная паездка — выдатны спосаб сэканоміць час. Дванаццаць гадзін у цягніку — і вось мы ў легендарным партовым горадзе.

Адэса лічыцца турыстычным цэнтрам у першую чаргу дзякуючы мору. Але калі вы трапіце сюды не падчас «сезона», то ўсё адно не засумуеце (а ў нечым нават выйграеце). Цэнтральную частку горада можна без перабольшвання назваць музеем пад адкрытым небам. Дастаткова зрабіць колькі крокаў ад вакзала — і вось вы на Малой Арнавуцкай вуліцы (той самай, дзе па версіі Астапа Бэндэра робяць усю кантрабанду), калі пайсці налева — патрапіце на легендарны рынак Прывоз (цяпер ён, праўда, не нашмат адрозніваецца ад нашых Ждановічаў, але візіт варта нанесці толькі дзеля яго асаблівай аўры). Адэскі оперны тэатр 1887 года пабудовы, вуліца Дэрыбасаўская, якую нават не трэба прадстаўляць, Пацёмкінская лесвіца, з вяршыні якой адкрываецца шыкоўны від на порт, славутыя катакомбы, агульная даўжыня якіх перавышае — удумайцеся — 2,5 тысячы кіламетраў (падчас вайны тут даволі паспяхова дзейнічаў атрад савецкіх партызан), Адэская кінастудыя, дзе ствараліся дзясяткі стужак, якія ўжо сталі класікай... Дарэчы, нямала тут і славутасцяў, звязаных з беларусамі. У горадзе ёсць помнік і памятная шыльда Адаму Міцкевічу (паэт жыў на Дэрыбасаўскай некалькі месяцаў і нават прысвяціў гораду цыкл сваіх санетаў), тут у 1917 годзе знаходзіўся адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай мовы Сцяпан Некрашэвіч (яго намаганнямі ў Адэсе тады запрацавала 30 пачатковых беларускіх школ), тут нарадзіўся класік нашай літаратуры Янка Брыль.

Апошнім пунктам вандроўкі стаў Львоў — горад, які цяпер перажывае сапраўдны турыстычны «бум». Асабліва яго любяць нашы суайчыннікі — тут захавалася шмат заходнееўрапейскай архітэктуры, якая амаль не дажыла да нашых дзён у Беларусі. З Адэсы да Львова штодзень ходзіць начны цягнік, купэ ў якім каштуе каля 30 беларускіх рублёў у эквіваленце.

У сталіцы Заходняй Украіны мы правялі ўсяго адзін дзень. Але нават гэтага дастаткова, каб атрымаць уражанне аб горадзе. Галоўнае, у чым пашанцавала Львову, — захаванне аўтэнтычнага архітэктурнага аблічча. Прычым не толькі ў гістарычным цэнтры, але і на значнай адлегласці ад яго. Першае месца, якое варта наведаць, — плошча Рынак і яеваколіцы. Тут знаходзіцца гарадская ратуша, пад'ём на вежу якой рэкамендуецца толькі загартаваным турыстам — 60 метраў уверх па драўлянай лесвіцы адолее не кожны. Тут жа можна пасядзець у адной са шматлікіх кавярняў і набыць украінскія сувеніры. Абавязковае для наведвання аматарамі гісторыі месца — Музей Арсенал, дзе сабрана калекцыя разнастайнай зброі з больш як трыццаці краін свету: ад тэўтонскіх мячоў і татарскіх шчытоў да марцір, якія стралялі 30-кілаграмовымі ядрамі, і дуэльных пісталетаў. Калі вы раптам стаміліся ад падарожжа і людскога натоўпу, абавязкова наведайце Стрыйскі парк, які лічыцца адным з найпрыгажэйшых ва Украіне. Ёсць тут і звязаныя з Беларуссю славутасці, напрыклад палац Сапегаў — вядомага шляхецкага роду ВКЛ. З той прычыны, што мы не паспявалі паглядзець на ўсё, што запланавалі, вырашылі пайсці самым простым шляхам — падняліся на Замкавую гару, адкуль адкрываецца шыкоўны від на цэнтр Львова.



Наведаць Кіеў варта хоць бы дзеля помніка Уладзіміру Караткевічу.

Пабачылі ўсё за адзін раз, няхай і з вялікай адлегласці.

Самы эканомны спосаб вяртання ў Беларусь — паездка на прыгарадных цягніках з перасадкамі. Па вечарах ад Львоўскага вакзала адпраўляецца «дызель» на Ковель, квіток на які каштуе каля 2 рублёў, праз гадзіну пасля яго прыбыцця стартуе «дызель» у беларускі памежны аграгарадок Хаціслаў. Кошт білета — каля 1 рубля. Праз гадзіну цягнік ужо знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, і пасля памежнага надгляду можна перасаджвацца з яго ў электрычку Хаціслаў — Брэст, якая чакае на суседнім пуці (квіток коштам 1 рубель можна набыць проста ў вагоне ў кантралёра, ісці ў білетныя касы не трэба). Такім чынам, паездка са Львова ў Брэст будзе каштаваць усяго 4 беларускія рублі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by
Фота аўтара.

Лічыльнік

Галоўнае, што прыемна здзіўляе ва Украіне, — цэны. Па большасці пазіцый яны меншыя за беларускія. Асабліва гэта адчуваецца ва ўстановах харчавання. Рознага кшталту стрыт-фуд (шаўрму, фалафель, бургеры і іншае) нам даводзілася каштаваць толькі праз уласную цікаўнасць, а не ў мэтах эканоміі. Сярэдні кошт абеду ў тутэйшай кавярні — 15 рублёў. За восем дзён падарожжа яны пераўтвараюцца ў 120. Дадаём сюды вулічныя «перакусы» і ласункі і атрымліваем бюджэт на харчаванне каля 150 рублёў. У кожным горадзе варта пакаштаваць штосьці сваё: у Кіеве — боршч з пампушкамі (ці параўнаць мясцовыя дзеруны з нашымі дранікамі), у Адэсе — абавязкова ўзяць мясцовай цюлькі, у Львове — каву і дэсерты. Асобна варта сказаць пра порцыі — дзе-дзе, а ў кухонным пытанні шчодрасць украінцаў праяўляецца вельмі яскрава.

Няблізкі свет

ВОСТРЫ «СМАК» КАРЭІ

У наш час усё большую папулярнасць набірае такая форма навучання, як студэнцкі абмен. Вучыцца за мяжой — мара многіх, але спраўдзіць яе пакуль што могуць адзінкі. Студэнтка пятага курса Інстытута журналістыкі БДУ Ганна ВАСІЛЕЎСКАЯ ўваходзіць у лік такіх шчасліўцаў. Дзяўчына па праграме студэнцкага абмену вучылася ў Паўднёвай Карэі.

Карэйскую мову Ганна вывучае ўжо два гады. Тры семестры — у Беларусі, у школе імя караля Сяджона, і адзін — у карэйскім універсітэце Кукмін. «Пры жаданні кожны можа вывучыць яе. Спачатку было крыху складана, але потым я пачала глядзець карэйскія кінафільмы, слухаць карэйскую музыку. Стала лягчэй усё ўспрымаць, — расказвае дзяўчына. — Да паездкі амаль не карысталася карэйскай мовай, таму што не было з кім размаўляць. А калі прыехала ў Сеул, то ў першы ж дзень трэба было вырашаць шмат бытавых пытанняў. Прыйшлося загаварыць. І вучыць патрэбна было ўсё вельмі хутка. Цяпер я ўжо магу падтрымаць размову».

Паехаць па абмене дзяўчыне прапанавалі выкладчыкі карэйскай мовы. Галоўнае патрабаванне — добрая вучоба. Ганна і яшчэ адна дзяўчына з БДУ жылі ў Сеуле. Іншыя — у другім горадзе. Праграма абмену займае шэсць месяцаў.

— Перад пачаткам семестра даводзіцца выбіраць прадметы, якія будзеш вывучаць, — пяць-шэсць дысцыплін. У спісе таксама ўказана мова, на якой будзе чытацца прадмет. «Калі студэнт адчувае ў сабе сілы, то можа выбраць усе прадметы на карэйскай. У мяне былі і на карэйскай мове, і на англійскай, — расказвае Ганна. — Трэба здаваць два пісьмовыя экзамены. Першы — у сярэдзіне семестра і другі — у канцы. Наведванне — вельмі важнае. А яшчэ няма размяжоўвання на лекцыі і семінары. У карэйскім універсітэце навучанне вядзецца пераважна ў форме лекцый. Бывае, што трэба напісаць міні-тэст або падрыхтаваць прэзентацыю. Апошняя работа — абавязковая ў групе. Увогуле, увесь працэс навучання скіраваны на пашырэнне сувязей, таму кожны раз аказваешся ў кампаніі новых студэнтаў.

У цэнтры Сеула. «Тондэмун» у перакладзе азначае «вялікія паўднёвыя вароты». Адзін з сімвалаў горада.

Дзяўчына жыла ў інтэрнаце. У пакоі было чатыры чалавекі: дзве беларускі і дзве манголкі. «Цікавых сітуацый было шмат, — успамінае студэнтка. — Здаралася, што на вуліцы да нас маглі падысці карэйскія дзяўчаты і пачаць размаўляць на англійскай мове, а калі даведваліся, што мы размаўляем на рускай, то таксама пераходзілі на яе».

Арыентавацца ў мегаполісе проста. Усё дзякуючы таму, што бясплатны інтэрнэт даступны ў любым месцы Сеула. Можна загрузіць карту ці знайсці іншую карысную інфармацыю.

Асобна трэба сказаць пра ежу. Карэйская — вельмі вострая. «Ад яе кідае ў пот, чырванее твар. Аднаго разу мы заказалі нявострыя такпокі (традыцыйная карэйская страва з рысавай мукі). Некалькі разоў паўтарылі, каб прынеслі менавіта такія. У выніку гэтыя такпокі нам прыйшлося запіваць вялікай колькасцю вады, таму што здавалася, быццам поласць рота нечым апякло», — успамінае Аня. Яшчэ адна адметнасць — мяса ў крамах прадаецца не кілаграмамі, а грамамі, таму што вельмі дорага каштуе. У рэстаранах, напрыклад, мяса смажаць не на кухні, а за тваім столікам. Можна і самому гэта зрабіць, калі ёсць жаданне.

— Уражанні ад Паўднёвай Карэі ў мяне засталіся самыя прыемныя. Чужая культура — гэта заўсёды цікава. Напрыклад, у карэйскім метро ёсць спецыяльныя месцы для пажылых людзей, іх ніхто і ніколі не займае. А вось у аўтобусе бабулі або дзядулю рэдка калі ўступяць месца, — дзеліцца сваімі назіраннямі Ганна.

Ганна Васілеўская каля палаца Кёнбокун.

— Таксама нам удалося пабываць на традыцыйнай цырымоніі пахавання, дакладней, на яе гістарычнай рэканструкцыі. Удзельнікі ў нацыянальных касцюмах паказвалі сцэну пахавання карэйскага манарха. Гэта на самай справе маштабная падзея. Мне было вельмі цікава.

Марына ЛЯШКЕВІЧ,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 11 2016 г.

SEX=БАЛЯСЫ

САКРЭТЫ НЕРАЗУМЕННЯ

Прачытаў нядаўна анекдот, які падаўся не столькі смешным, колькі філасофскім. «Неразуменне — гэта тое, што дазваляе мужчынам і жанчынам захоўваць інтарэс адно да аднаго». Пагадзіцеся, што ў пэўным сэнсе яно сапраўды так і ёсць. Мы розныя, і ў гэтым, мабыць, крыецца галоўная таямніца ўзаемнай увагі. Гэткая пуцяводная нітка, якая вядзе нас па жыцці. Хоць, прызнаемся, зразумець адзін аднаго часам бывае ну-у вельмі складана. («Як кажуць: «мужчына — з Марса, а жанчына — з Венеры». Дык вось, Венера — адзіная планета, якая круціцца супраць гадзіннікавай стрэлкі. Вось тут я і задумаўся пра жаночую логіку...») Думаецца, з-за таго, што мужчыны — істоты найперш лагічныя па сваёй сутнасці, а жанчыны — эмацыянальныя. («Мужчына ад жанчыны чым адрозніваецца? Вытрымкай. Ляжыць жанчына, не вытрымае, ускочыць, мітусіцца, нешта робіць. Мужчына ляжыць сабе далей. Перасільвае».)

Як слушна гаварыў са сцэны Віталь Каламіец, колішні чэмпіён Вышэйшай Лігі КВЗ у складзе каманды БДУ, «Мужчына — гэта хлопчык, які выпадкова выжыў». Памятаеце: «Сынок, не падыходзь да разеткі!.. Ну... Затое цяпер ты ведаеш, што такое пераменны ток...»? Кіравацца логікай хлопчыкаў з ранняга маленства прывучае само жыццё. («Ты мяне слухаеш увогуле? — Так. — Ну, і пра што я зараз гаварыла? — Пра сваю жаночую лухту, як звычайна. — Добра, гэтым разам табе пашанцавала».) Прынамсі, так было раней. Усведамленне, што пугач пры выпрабаваннях здольны выбухнуць у руках і пальцы паадрываць, што падстаўляць далонь у якасці мішэні для стралы з лука — не самае лепшае рашэнне, прыходзіць тады, калі ўсё ўжо адбылося. («Не бывае позна, бывае ўжо не трэба».)

«І чаму мужчыны баяцца жанчын? І што можа жанчына зрабіць? Ну, настрой сапсаваць, ну, жыццё паламаць... І ўсё!»

У дзяўчат жа ўсё павінна быць найперш прыгожа! Любой цаной! («Пяцігадовая дзяўчынка прыходзіць у новай руковай сукенцы ў дзіцячы сад. На пытанне выхавальніцы, адкуль такая сукеначка, з гонарам адказвае: «Нараўла!») А яшчэ для прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва вельмі важна адчуваць, што яна заўсёды мае рацыю. Нават калі гэта не так. («Мая сёння выдала: «Вось даводзіць да шаленства спрэчка з табой! У цябе проста аргументаў больш, з-за гэтага падаецца, што быццам ты маеш рацыю! А ты не маеш рацыі!!!») Ну, і вядома, шопінг! («Дзяўчына не можа быць шчаслівай, пакуль не абзавядзецца дастатковай колькасцю адзення, якое можна не апранаць».) Вось мы, прадстаўнікі іншай паловы чалавецтва, усё ж пра гэта ведаем. І ў большасці выпадкаў — не разумеем. Дакладней, разумеем, што гэта непаразуменне. («Мужчыны, не спрабуйце зразумець жанчын. Мала таго, што яны часам мыюць галаву асобна ад цела, дык некаторыя яшчэ і грыўку мыюць асобна ад усёй галавы».) І тым не менш мы «вядзёмся», цягнемся адно да аднаго, як за той пуцяводнай ніткай. Прымаем правілы гульні, спадзеючыся, што зможам падмануць «сістэму». («І чаму мужчыны баяцца жанчын? І што можа жанчына зрабіць? Ну, настрой сапсаваць, ну, жыццё паламаць... І ўсё!») Галоўнае, не палохацца, і ўдача абавязкова ўсміхнецца вам!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Хоць, трэба прызнаць, неразуменне можа спрацаваць «на інтарэс», толькі калі яно сапраўды ў меру. («Усё! Заўтра кардынальна мяняю сваё жыццё!!! — Ляжаш на тэлевізар і будзеш глядзець на канапу?») Нядаўна жыхар Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў вырашыў скасаваць шлюб з жонкай адразу пасля таго, як атрымаў магчымасць убачыць яе твар без макіяжу. Пара адпачывала на пляжы і 24-гадовая жанчына змыла «расфарбоўку», каб паплаваць. Муж быў шакіраваны непрывабнай знешнасцю сваёй палавінкі. Высветлілася, што тая зрабіла мноства пластычных аперацый, сляды якіх сталі заўважныя на твары, апроч таго, яна насіла каляровыя кантактныя лінзы і накладныя вейкі. 30-гадовы мужчына палічыў сябе падманутым і катэгарычна адмовіўся прымірыцца з жонкай. Тая быццам бы збіралася ўсё расказаць мужу, але зацягнула з гэтым. Дарэчы, пара да заключэння шлюбу была паўгода ў заручынах. («Як прайшла першая шлюбная ноч? — Не ведаю, я страціў прытомнасць адразу пасля таго, як яна адклеіла накладныя вейкі...»)

Бываюць яшчэ больш клінічныя выпадкі. Мікіту Джыгурдзе не дапамагло ні галенне барады, ні ўзятае новае мудрагелістае імя, ні абяцанне тварыць далей у «любові без правілаў». Марына Анісіна, яго жонка, нарэшце вырашыла скасаваць шлюб, назваўшы эпатажнага мужа — ні многа, ні мала — хворым. («Акей, гугл! Як адрозніць прынца на кані ад вершніка апакаліпсіса?») Шмат жа ёй спатрэбілася часу, каб зразумець гэта... («Даведаліся адно пра аднаго бліжэй і паслалі адно аднаго як мага далей».) Наўздагон падзеі толькі і застаецца што сказаць Джыгурдзе: «Кінула жонка? Не пабіўся, і тое добра»...

...У мяне ёсць світар, які праблематычна нацягнуць на сябе аднаму: рукавы скручваюцца. Я жартую, што такія нельга прадаваць адзінокім мужчынам. На дапамогу кожны раз прыходзіць якраз жонка, без лішніх слоў выпрасткваючы іх. («У адносінах галоўнае, каб абодва любілі шаўрму».) Памятаеце словы адной песні Ганны Герман? «Надзея — мой компас зямны, а ўдача — узнагарода за смеласць»? Дык вось, зычу кожнаму правільнага азімута па жыцці і сваю Надзею.

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«МЫ НЕ «ДЫНАЗАЎРЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Косця, можна сказаць, што ў цябе класічная школа вакалу. Ты вучыўся ў Пятра Ялфімава, перамагаў на многіх міжнародных конкурсах, а тут раптам — метал-праекты!

Канстанцін: — Вучыцца спяваць я пачаў толькі пасля таго, як стаў металістам *(смяецца)*. Ды і з Пятром мы пазнаёміліся дзякуючы такой музыцы, падчас адной з вечарын у падтрымку маладых гуртоў, яшчэ ў пачатку 2000-х.

— З Пятром цяпер часта выступаеце, сябруеце?

Канстанцін: — І сябруем, і часам выступаем разам. І сяброўства, канешне, звязанае з сумеснай творчасцю. Ды і Пётр, які, здавалася б, мае кансерваторскую адукацыю, сам педагог, па сутнасці з'яўляецца металістам. Ды ён і пазіцыянуе сябе хутчэй як рок-выканаўца.

Дзмітрый: — Сёлета Пётр разам з намі выступаў падчас канцэрта ў клубе Re:Public. У нас нават атрымалася зняць якаснае відэа, запісаць якасны гук. Думаю, у хуткім часе мы гэты запіс прадставім публіцы.

— Не так даўно ў гурце з'явіліся аж тры новыя музыканты, маладыя. Як іх прыход паўплываў на калектыў?

Дзмітрый: — Змянілася ўсё толькі ў лепшы бок. Мы цяпер сталі больш цэльнай камандай. І па духу, і па кірунку мыслення. Усе хлопцы маюць вышэйшую музычную адукацыю, багаты вопыт і вельмі любяць такую музыку. Выдатна, што ў камандзе зараз спалучаецца і жаданне нешта зрабіць, і высокі прафесіяналізм выканання. Таму працуем над новым матэрыялам, і творчасць зрушылася з мёртвай кропкі, на якой мы доўгі час знаходзіліся. Цяпер для нас — ідэальны перыяд у творчасці, бо не даводзіцца разглядаць стары матэрыял. Хлопцы вельмі хутка вывучылі ўвесь рэпертуар, таму рэпетыцыі прысвячаем толькі стварэнню новых кампазіцый.

Канстанцін: — Цікава атрымалася, што сёння студэнты музычных ВНУ класічны рок успрымаюць як нешта хрэстаматыйнае, вартае вывучэння. Менавіта такія хлопцы прыйшлі ў гурт, і нават настрой у кампаніі стаў лепшы. Калі раней нас аб'ядноўвалі пэўныя навыкі, стылістычны падыход, але мы былі рознымі людзьмі і па ўзросце, і па светаўспрыманні, то сёння і ўзроставы баланс, і адзінства поглядаў захоўваецца.

— Слухачам ужо нешта новае прадстаўлялі, створанае менавіта ў такім складзе?

Дзмітрый: — Не так даўно выпусцілі новую песню «Насустрач вятрам», ідзе работа яшчэ над некалькімі кампазіцыямі. Таксама запісалі два канцэрты, адзін з іх ужо прадстаўлены ў інтэрнэце, а другі думаем прэзентаваць у вельмі цікавай анлайн-форме з магчымасцю абмеркавання разам са слухачамі. Паколькі мы не так многа выступаем у іншых гарадах, але часта чуем просьбы правесці канцэрты, то такая інтэрнэт-прэзентацыя будзе хутчэй для іх, каб аднавіць атмасферу канцэртнага выступлення.

— Цяпер продаж дыскаў для многіх гуртоў, ды і для вашага, мяркую, таксама не з'яўляецца крыніцай заробку. Менавіта таму вы не супраць, што песні гурта з'яўляюцца ў інтэрнэце ў свабодным доступе?

Дзмітрый: — Мы самі іх прапаноўваем для бясплатнага спампоўвання і пацвярджаем, што далі дазвол для праслухоўвання. Прытым прапануем слухачам трэкі ў высокай якасці. А дыскі сапраўды прадаём за сімвалічныя грошы ці дорым. Гэта магчымасць для фанатаў, якія хочуць падтрымаць гурт.

«Сёння студэнты музычных ВНУ класічны рок успрымаюць як нешта хрэстаматыйнае, вартае вывучэння».

Канстанцін: — Многія слухачы набываюць дыскі толькі дзеля калекцыі, ім падабаецца іх збіраць. Ёсць нават прыхільнікі, якія маюць усе рэлізы, што мы некалі рабілі, на дысках. Гэта вельмі прыемна. Але, напэўна, мы прайшлі пэўны этап, калі, наглядзеўшыся фільмаў пра Metallica, Iron Maiden, таксама марылі, што будзем ездзіць у вялікія туры. Магчыма, такое некалі і здарыцца. Але калі гэтага не будзе — нічога страшнага. У нас свой шлях, свае прыхільнікі і канцэрты. Гэта таксама выдатна.

— А хто вашы класічныя фаны?

Канстанцін: — Ёсць вельмі маладыя людзі, якія, магчыма, толькі нядаўна даведаліся пра існаванне нашага гурта. А ёсць і «старажылы», якім за 40.

Дзмітрый: — Падчас выступлення на фестывалі «Наш Грунвальд» я пад сцэнай заўважыў хлопца ў майцы з выявай рэпера Eminem і вельмі здзівіўся, калі ён спяваў разам з намі амаль усе песні. Слухачы вельмі розныя. Але ёсць адна рыса, якая іх аб'ядноўвае, — вялікая любоў да нашай творчасці, песень. Таму калі Косця аддае мікрафон у залу, усе з задавальненнем спяваюць. Нават калі граем абсалютна новую песню, якую выклалі літаральна за некалькі дзён да канцэрта, усё роўна публіка паспявае яе вывучыць. Гэтая адданасць дарагога вартая.

— Вы не крыўдуеце, калі нехта ў вашай музыцы знаходзіць падабенства з іншымі камандамі? Згадаю класічны варыянт параўнання з праектам «Кіпелаў».

Дзмітрый: — Падабенствы можна знайсці заўсёды. Кожны гурт грае тое, што блізка па духу, і зразумела, што ўсе некалі ўвабралі шмат ад заснавальнікаў стылю. Без сумненняў, недзе такое выказванне будзе справядлівым. Але ж ключавым момантам для гурта з'яўляецца іх матэрыял. Ён або падабаецца людзям, або не. Можна напісаць шмат класных песень, падобных на нечыя, і іх палюбіць публіка, а можна зрабіць унікальную музыку, якая нікому не будзе патрэбнай. Мы робім стаўку на пошук цікавага матэрыялу — гармоній, мелодый, рытмаў.

«Падчас выступлення на фестывалі «Наш Грунвальд» я пад сцэнай заўважыў хлопца ў майцы з выявай рэпера Eminem і вельмі здзівіўся, калі ён спяваў разам з намі амаль усе песні».

— Над чым цяпер працуеце?

Дзмітрый: — Над сінглам «Эра чорных люстэркаў». Гэтая песня часткова пераклікаецца з канцэпцыяй серыяла «Чорнае люстэрка». Магчыма, калі паспеем, прэзентуем яго яшчэ да Новага года. Наўмысна стараемся, каб тэмы песень былі актуальныя і неслі моцны пасыл слухачу.

Канстанцін: — Паспрабуем адысці ад кананічных прыёмаў металу — гераікі, эпікі, пафасу, драконаў. Не скажу, што ў нас такое было, але хочацца пазбягаць штампаў. Мы не «дыназаўры», жывём у сучаснасці, таму ад «старажытных» рысаў будзем пазбаўляцца. Мне падаецца, што шчырая творчасць будзе знаходзіць водгук у сэрцах і розумах людзей. Менавіта такую музыку мы і робім.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 02.11.2016 г.

■ Гасцёўня «Звязды»

БУДУЮЧЫ СЛОВАМ

Пісьменнік Ганад Чарказян — пра сяброўства з класікамі беларускай літаратуры і тое, як наша краіна стала для яго роднай

Гэтымі днямі, калі збіралася на інтэрв'ю з Ганадам Чарказянам, на маім начным століку ляжаў зборнік твораў аўтара «Пад адным небам». Гэта другая (пакуль што) кніга пісьменніка, якая, быццам снатворнае, дзейнічае на маю падсвядомасць перад сном. Ці як халодны душ, калі, толькі што прачнуўшыся, навобмацак цягнешся да знаёмай вокладкі, каб набрацца светлых думак на новы дзень і пераняць хоць крышачку мудрасці з сакавітых радкоў аўтара.

А, між іншым, гэтая ўласцівая беларусам мудрасць ліецца з вуснаў курда па нацыянальнасці. На днях Ганад Чарказян, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, завітаў у нашу рэдакцыю.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

«Калі я добра адношуся да чалавека, гэта на ўсё жыццё. Іначай быць не можа».

— Ганад Бадрыевіч, як атрымалася, што курд па нацыянальнасці, які нарадзіўся ў Арменіі, стаў беларускім пісьменнікам?

— Тады, напэўна, гэта не было вялікім дзівам: мы ўсе жылі ў адной краіне, якая называлася Савецкім Саюзам. Я яшчэ ў школе чытаў класікаў беларускай літаратуры: Якуба Коласа, Янку Купалу, Броўку, Багдановіча... Анталогія беларускай літаратуры, выдадзеная на армянскай мове, была ў маёй бібліятэцы. Гэта адзіная кніга, якую я прывёз з сабой у Беларусь.

Упершыню я прыехаў сюды ў 1969 годзе. Якраз у той год адкрывалі мемарыяльны комплекс «Хатынь». Апынуўшыся там, я быццам трапіў у іншы свет. Хоць і чытаў шмат пра Вялікую Айчынную вайну, ведаў, што беларускі народ больш чым хто пацярпеў, але калі ўсё ўбачыў на свае вочы, мне стала дрэнна. Вядома ж, малады, уражлівы. Нават не змог сесці ў аўтобус! Ішоў пехам. Ужо цямнела, як спыніўся «Масквіч». Мужчына прапанаваў падвезці і высадзіў мяне амаль каля самага дома, дзе я жыў. Я даваў яму грошы, а ён нават пакрыўдзіўся. Такой была першая сустрэча з беларускім характарам. Другі выпадак быў, калі я працаваў у дарожна-даследчым інстытуце. Правяралі якасць дарог у раёне Лепеля. Лета, спёка, дзесьці далёка віднеецца хутар. Раптам адтуль аддзяляецца кропка і праз поле рухаецца да нас — матэрыялізаваўся стары чалавек. Ён трымае ў руках збан з малаком і кажа: «Сынкі, я бачыў, што вы тут працуеце, і вырашыў, што вам трэба папіць». Ён і дагэтуль стаіць у маіх вачах.

— Але вы не кажаце пра тое, што менавіта беларуска стала вашай абранніцай. Ці не каханне прымусіла вас змяніць месца жыхарства?

— Я працаваў тады на суднарамонтным заводзе ў Туапсэ. І трэба было мне паехаць у Арменію на вяселле брата. Назад вяртаўся на цягніку Ерэван — Масква. Бачу, у тамбуры стаіць дзяўчына. Прыгожая такая. Дарога доўгая, разгаварыліся. Так і прагаварылі ўсю ноч. Апамятаўся, што трэба выходзіць, калі ўжо хвілін 20 цягнік прастаяў у Туапсэ. Рэчы збіраў на хаду. На шчасце, паспеў папрасіць нумар тэлефона. Так і пачалося наша сяброўства з Людмілай Іванаўнай. Перад арміяй нават на два дні прыязджаў у Мінск. Потым перапісваліся. Пісалі адзін аднаму смешныя лісты, і дагэтуль яны ў мяне захоўваюцца. У нас былі рамантычныя адносіны. Праз пяць гадоў мы пажаніліся. Разам ужо больш як 40. Калі я добра адношуся да чалавека, гэта на ўсё жыццё. Іначай быць не можа.

— Ці памятаеце, пра што быў ваш першы твор?

— Першым маім вершам быў гумарыстычны. Як ні дзіўна, пра бацьку. Яму не спадабалася. Ён нават разлавацца і забраў мой сшытак, куды я запісваў усе свае вершы. Калі бацькі не стала, мы, усе браты (нас было чацвёра родных і адзін зводны), сабраліся ў бацькоўскім доме. Помню, як мачаха вынесла каробку і сказала, што гэта для мяне пакінуў бацька. Мы з ім рассталіся нядобра: ён не хацеў, каб я сыходзіў з дому. Пры ўсіх я адкрыў каробку і быў моцна здзіўлены: там ляжаў сшытак, які некалі забраў у мяне бацька, усе мае публікацыі, што з'яўляліся ў друку. Аказваецца, ён іх збіраў...

Упершыню мой верш надрукавалі ў рэспубліканскім часопісе «Піянер», у тым жа, 1963 годзе, у газеце «Голас піянера» з'явілася і маё першае апавяданне. Помню, нават у Ерэван ездзіў: у рэдакцыі сумняваліся, што я, вясковы хлопец, мог так напісаць. За верш, надрукаваны ў «Піянеры», атрымаў ганарар і купіў 22 порцыі пламбіру — кожнаму аднакласніку.

Мамы не стала, калі я хадзіў у 8 клас. Апошнія гады школа знаходзілася за сем кіламетраў — у дзень выходзіла па 14. Горш за ўсё было зімой: цемрай ідзеш, цемрай вяртаешся. І ўвесь дзень галодны: соромна ж было браць з сабой ежу. А яшчэ на нашай вуліцы, дзе мы жылі, часта адключалі святло. А ўрокі трэба ж было вучыць! У нас «буржуйка» была. Адчыняў дзверцы, станавіўся каля яе на калені і пісаў, чытаў.

— У свой час вы займелі сабе сур'ёзную падтрымку ў класікаў беларускай літаратуры...

— Мне пашанцавала. Я ўдзячны за гэта Броўку, Барадуліну, Лойку, Быкаву. Я прачытаў усё, што ў Васіля Уладзіміравіча было перакладзена на рускую мову, і зразумеў, якім багатым быў яго ўнутраны свет, якім супярэчлівым. Мне цяжка ўспомніць, каб ён калі-небудзь па-сапраўднаму радаваўся. Ён заўсёды быў сур'ёзным, ні аднаго лішняга слова, пазбягаў праяўлення эмоцый. З Рыгорам Барадуліным у нас былі братэрскія адносіны. На яго Бацькаўшчыне, ва Ушацкім раёне, я гасцяваў не аднойчы. Летам я быў там апошні раз, і хата ўжо не тая без свайго гаспадара. Калі ў хаце ніхто не жыве, яна «памірае». І калі ў хуткім часе там не зрабіць музей народнага паэта Беларусі, многае можна страціць.

— Гэта праўда, што першым ваш талент заўважыў Пятрусь Броўка?

— Пятро Усцінавіч быў для мяне як бацька. І ён адносіўся да мяне як да роднага сына. Гэта чалавек-эпоха, вялікі інтэрнацыяналіст. Пазнаёміліся мы, калі я працаваў інжынерам-сметчыкам у адной будаўнічай арганізацыі. Аднойчы мяне выклікалі на планёрку да дырэктара. Бачу, за сталом пажылы мужчына сядзіць, побач ляжыць кепка, на пінжаку — Зорка Героя Сацыялістычнай Працы. Ім аказаўся Пятрусь Броўка. Мне было даручана заняцца рамонтам лецішча пісьменніка, якое знаходзілася ў Ждановічах. Прымаў работу сам народны паэт, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. Задаволены Пятрусь Броўка ўручыў мне пакет: а там — сем кніг аўтара, ды яшчэ і з аўтографамі!

Калі ў газеце «Во славу Родины» апублікавалі маё армейскае апавяданне, патэлефанаваў Пятро Усцінавіч і паведаміў, што ў ваеннай газеце друкуецца мой цёзка. Мы былі знаёмыя два гады, а я ўсё не адважваўся сказаць, што пішу вершы і прозу. Ужо потым з яго лёгкай рукі мае творы пачалі друкавацца ў «Нёмане».

Аднойчы мы шпацыравалі каля стадыёна «Дынама», і я прагаварыўся, дзе жыву, нават дом паказаў. І вось святкую сваё 30-годдзе, і раптам званок у дзверы. Пляменніца кажа, што прыйшоў пажылы чалавек. А ў нас у двары жыў мужчына, Савелічам звалі, кантраляваў двор. Я думаў, ён прыйшоў. Выходжу — стаіць у дзвярах Пятро Усцінавіч і трымае тры гваздзічкі, якія ўжо апусцілі галоўкі. Я прадставіў госця сваім сябрам — усім мову заняло.

— У кожнага паэта свае чатырохрадкоўі. Кароткія вершы Ганада Чарказяна называюцца чаргаві, што ў перакладзе з курдскай мовы азначае чатыры крокі. Як удаецца ўмясціць глыбокі сэнс усяго ў чатыры радкі?

— Сапраўды, у гэтую маленькую прастору часам трэба ўмясціць нешта вялікае, што ты хочаш сказаць. Як гэта адбываецца, я не ведаю. У мяне неяк спыталі, як пішуцца вершы. Я ніколі не рыхтуюся да гэтага. Калі ў мяне агідны, вельмі нядобры настрой, калі я засмучаны, мяне кранулі да глыбіні душы або я пакрыўджаны, магу напісаць чаргаві. Памятаю, аднойчы быў такі стан, я сеў і запар напісаў 60 чаргаві.

— Першай вашай кнігай, якую я прачытала, была «Горкі пах палыну». Я вельмі супераживала галоўнаму герою і злавіла сябе на думцы, што хацела б даведацца пра яго далейшы лёс...

— Увогуле, чаму з'явіўся гэты раман? Сам я ў Афганістане не быў, але пра воінаў-інтэрнацыяналістаў ведаю шмат. Мяне заўсёды цікавіў вобраз звычайнага жыхара Афганістана, простага чалавека, якога не турбуе ні вайна, ні палітыка. Больш за тое, у афганцаў і курдаў — агульныя карані. У нас падобныя звычаі. Таму мне не трэба было прыдумляць, як яны ставяцца адзін да аднаго.

«Патэлефанаваў Пятрусь Броўка і паведаміў, што ў ваеннай газеце друкуецца мой цёзка. Мы былі знаёмыя два гады, а я ўсё не адважваўся сказаць, што пішу вершы і прозу».

Чаму раман напісаны ад першай асобы? Гэты чалавек — я, які прыехаў у чужую краіну, дакрануўся да іншай культуры, псіхалогіі. Я на сабе адчуў усё тое, што і мой герой. Толькі ён у Афганістане, а я тут. Я і дагэтуль адкрываю для сябе Беларусь. Але культура аб'ядноўвае. Існуе вялікая колькасць звычаяў, якія тысячагоддзямі шануюць як курды, так і беларусы. Карані нашы цесна пераплецены паміж сабой.

Доўгія гады я рыхтаваўся працягнуць работу над раманам. Баяўся, бо ведаў, што гэта такое: трэба пазбавіцца ад усялякіх думак і сканцэнтравацца толькі на рамане. Калі памятаеце, у галоўнага героя ў Афганістане засталіся дзеці. Адказнасць за іх, кроўная сувязь прымусіць яго вярнуцца. Я не буду раскрываць усе дэталі, скажу толькі, што другая частка рамана будзе прыгодніцкай: галоўны герой, які ўжо ведае мясцовую мову і звычаі, вяртаецца ў Афганістан з заданнем. Будуць розныя выпрабаванні, але я хачу, каб ён застаўся такім жа чыстым хлапчуком, якім быў раней.

— Вас можна назваць шчаслівым пісьменнікам. Выдаць столькі кніг, а самае галоўнае займець прызнанне ў чытача, здольны не кожны айчынны пісьменнік. Як удалося за дастаткова непрацяглы час адчуць, што патрэбна чытачу-беларусу?

— Вяртаемся да нацыянальнасці. Звыш 45 мільёнаў курдаў налічваецца ў свеце, а дзяржаўнасці няма. Прыкладна тое ж у свой час было з беларусамі. Дзякуй богу, што беларусы не забыліся сваёй гісторыі. І я думаў, якая тэма была б ім даспадобы. Аб міры можна пісаць, аб доме, аб сям'і, якую прыйшлі і разбурылі чужынцы. У маіх творах — і ўнутраная трывога за Беларусь, многія прадстаўнікі якой хочуць жыць, як у Еўропе, забываючыся пра сваё блізкае і роднае. Калі элементарна не захаваць беларускую кухню, пра дранікі і калдуны можна будзе прачытаць толькі ў энцыклапедыі. У Беларусі я пражыў больш, чым дзесьці яшчэ. У мяне тут сям'я, сябры, свой дом. Беларускі народ мне чужы па крыві, але я лічу яго родным.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

Фота БЕЛТА.

■ Класныя навіны

ШАХМАТЫ ВЫХОЎВАЮЦЬ ЛІДАРАЎ

Рэспубліканская праграма «Шахматны ўсенавуч» стартавала ў Беларусі

У рамках пілотнага праекта «Шахматы — школе», які патрануюць міністэрствы адукацыі, спорту і турызму, НАК і Прэзідэнцкі спартыўны клуб, было закуплена больш за 300 шахматных набораў для адкрыцця шахматных класаў ва ўстановах адукацыі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

— Пасля сустрэчы кіраўніка дзяржавы з прэзідэнтам Міжнароднай шахматнай федэрацыі Кірсанам Ілюмжынавым было прапанавана шырока ўвесці вывучэнне гульні ў шахматы ў агульнаадукацыйных школах, — расказаў **намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.** — Для гэтых мэт падрыхтавалі больш за 440 педагогаў, якія змогуць навучаць шахматам школьнікаў першых—чацвёртых класаў. Таксама былі вызначаны ўстановы адукацыі, дзе будзе ўкараняцца факультатыў па праграме «Шахматны ўсенавуч».

Віктар Якжык расказаў, што ёсць сусветны вопыт выкладання шахмат у розных формах. (Для прыкладу, у Арменіі шахматы з'яўляюцца абавязковай дысцыплінай у пачатковай школе.) Педагагічнай і псіхалагічнай навукай даказаны станоўчы ўплыў шахмат, асабліва на дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Заняткі шахматамі стымулююць у дзяцей крэатыўнасць, лагічнае мысленне, стратэгічнае планаванне, развіваюць лідарскія якасці.

Праграма шахматнага факультатыву для беларускіх школ разлічана ў навучальным годзе на 29 гадзін. Ініцыятары праекта спадзяюцца, што пасля авалодання шахматнымі навыкамі дзеці будуць свядома папаўняць спецыялізаваныя дзіцяча-юнацкія ўстановы адукацыі і развіваць гэты інтэлектуальны від спорту ў нашай краіне.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ

о проведении аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для строительства многофункционального торгового центра, для строительства торгово-развлекательного центра в северо-западном районе г. Смолевичи Минской области, для строительства и обслуживания автостоянки и гаража-бокса для хранения автомашин специального назначения в г. Смолевичи Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 06.12.2016 г в 15-00
3	Продавец и его адрес	г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	Лот № 1 – площадь 0,2868 га, кадастровый номер 624850100001000776 г. Смолевичи, ул. Центральная Лот № 2 – площадь 1,4947 га, кадастровый номер 624850100005000761 северо-западная часть г. Смолевичи, Лот № 3 – площадь 0,0940 га, кадастровый номер 624850100002001302 г. Смолевичи, ул. Торговая
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Лот № 1 – для строительства многофункционального торгового центра Лот № 2 – для строительства торгово-развлекательного центра Лот № 3 – для строительства и обслуживания автостоянки и гаража-бокса для хранения автомашин специального назначения
7	Сроки аренды	Лот № 1 – 99 (девяносто девять) лет Лот № 2 – 99 (девяносто девять) лет Лот № 3 – 99 (девяносто девять) лет
8	Начальная стартовая цена	Лот № 1 – 100 000 рублей Лот № 2 – 200 000 рублей Лот № 3 – 35 000 рублей
9	Условия аукциона	А) продажа по цене не ниже начальной Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица; В) при проектировании и строительстве учесть регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом; Г) без права предоставления рассрочки
10	Наличие инженерной инфраструктуры	Лот № 1 – возможность подключения к газоснабжению, водоснабжению, централизованному водоотведению, электроснабжению, асфальтированный подъезд Лот № 2 – возможность подключения к газоснабжению, водоснабжению, централизованному водоотведению, централизованному теплоснабжению, электроснабжению Лот № 3 – возможность подключения к газоснабжению, водоснабжению, электроснабжению, централизованному теплоснабжению, асфальтированный подъезд
11	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона
12	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812 УНП 600014139 ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
13	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком	Каждый четверг 9-00—13-00

Расходы по организации и проведению аукциона (лот № 2 – 2256 р. 50 к. (убытки и потери ОАО «Смолевичи Бройлер» – 43137 р. 75 к.), лот № 3 – 1621 р. 20 к.), затраты на публикацию и размещение в сети Интернет информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 9.

Окончательный срок приема заявлений – 30.11.2016 г. 17.00.

Контактный телефон (8-01776) 5-53-42

Для участия в аукционе на адрес продавца необходимо предоставить:

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя - нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.

В суд Волковысского района поступило заявление о признании безвестно отсутствующей Месниковой Светланы Николаевны, 2 января 1973 года рождения, уроженки д. Субочи Волковысского района Гродненской области, последнее известное место жительства которой: Гродненская область, Волковысский район, г.п. Россь, ул. Матросова, 17/11, место нахождения которой неизвестно, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Месниковой Светлане Николаевне, сообщить их суду Волковысского района в течение двух месяцев с момента публикации.

УНП 500580576

Извещение о проведении первых и повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка (с учетом/до деноминации).

Лот №1. Земельный участок с кадастровым №22128481010100095, площадью 0,1447 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Новоселки, участок 3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина, оз. Белое). **Нач. цена:** 4 000/40 000 000 бел. руб. **Задаток:** 400/4 000 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314080109 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Летчанский сельисполком)

Лот №2. Земельный участок с кадастровым №22128591660100095, площадью 0,1495 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Шилы, ул. Приозерная, 43 Б, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, водоохранная зона рек и водоёмов (оз. Сосно), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Нач цена:** 1 478,98/14 789 800 бел. руб. **Задаток:** 147,90/1 479 000 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090173 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский сельисполком)

